

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ТЭРЭЗА АДАМОВІЧ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 18 (2503) Год XLIX | Беласток, 2 мая 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Ганна з Руткі (з фотаальбома „Zeit der Stille”) Фота SIEGWARD SCHMITZ

Ну, у Еўрасаюз...

Ганна Кандрацюк

Каля хаты знахаркі Ганны буслі-ная пара займаецца сексам.

— Хрыстос Уваскрос! — радасна крычу ў парозе, але ніхто не азываецца.

Па панадворку гойсаюць свінкі і чорна-белыя авечкі.

— Калі няма нікога ў хаце, значыць, у полі, се'юць, — кажуць у Рутцы.

Ганна замаўляе ўсе хваробы, але найбольш цешаць яе ўнучкі — так празывае чужых дзетак, што нарадзіліся пасля яе замоў. Дзеці — найбольшая радасць у гміне. На адно прыпадае амаль трыццаць дарослых.

Ганна не разбіраецца ў дэмаграфіі, і не думае пра Еўрасаюз.

Але Еўрасаюз думае пра яе.

— Прыехала да мяне адна з Варшавы і кажа, што я там у Інтэрнэце. А каб на вас бура, то яшчэ і туды мяне ўсадзілі, — абураецца народная лекарка.

Праўда, тэхніка для яе не навіна. І раней прыходзілася *замаўляць* па тэлефону пацыентаў нават з Амерыкі.

— А вашы авечкі ўжо з пашпартамі, — мяняю тэму, бо перад нашай лавачкай мэкаюць ягняты і бараны.

— А ну іх з пашпартамі і імёнамі!

Ганна прыгадвае, як абарвалася ёй ад мясцовага бацюшкі. Карацей, калі ў адным рэпартажы яна замаўляла па імені: *рабу божу Жоўтую карову*.

Тут як у Амерыцы

Пад крэкат жаб познім вечарам вяртаюся на плябанію ў Дубічы-Царкоўныя. Кватаруюць мяне ў бацюшкі, бо, — як кажуць настаўніцы, — там адпаведныя *варункі*. У старой плябаніі быў праведзены еўрарамонт і зараз напамінае яна шляхецкі двор. Ганак падперты драўлянымі калонамі.

Дубічы маюць шчасце, бо ў адрозненні ад войта і большасці мясцовых эліт, святар жыве на месцы. Асабліва ўпадабалі мясцовыя матушку Еву, якая, хоць беластачанка, навучылася размаўляць па-свойму, а да таго выглядам змахвае на Брок з тэлесерыяла „Мода на поспех”. Значыць, прыгожая.

Я таксама маю шчасце. Айцец Славамір — наш чытач і мой зямляк.

— Вы ж самі калісь напісалі, што ў нас — як у Амерыцы, — бацюшка цытуе мой рэпартаж пра веравызнанні ў Дубіччыне — у нас хто як хоча, так і верыць. Карацей, тут з праваслаўнымі пражываюць баптысты, спасапраабражэнцы, суботнікі, іегавісты, каталікі, атэісты ды ўсякія адхілы ад пералічаных веравызнанняў.

— Якія меркаванні вашых парафіян наконт Еўрасаюза?

— Кажуць, — паўтарае за іншымі матушка, — як за немца будзе. Што нельга будзе свіней з пашпартамі калоць.

На плябаніі жывуць толькі два каты і справа пашпартоў для жывёлы тут неістотная. Галоўнай, на сённяшні дзень праблемай для прыхода з'яўляецца ўпарадкаванне дакументаў звязаных з царкоўнай зямлёй. Дубіцкаму прыходу, паводле надзелу, належыць 130 гектараў, аднак за апошнія дзесяцігоддзі частка зямлі перайшла ў карыстанне грамадскіх устаноў і суполак. І зараз трэба вярнуць як найбольш, бо ў Еўрасаюзе за гектарам ідзе датацыя.

Што сёння? Прыхаджане рыхтуюцца да памінальнага свята, праз два дні Провады.

Школьны дэ бэст

З раніцы іду ў школу, дзе з усёй гміны вучыцца сотня дзяцей з пачатковай школы і паўсотні гімназістаў. Традыцыйна, усе тут у раз'ез-

[працяг ☞ 3]

Застой у адносінах да Беларусі ☞ 2

Мацей Халадоўскі

Юзаф Алексы: Не хочам ніякай заслоны, нават блакітнай. Адносіны з Усходам павінны быць трактаваны Польшчай прыярытэтна, а ў шмат якіх выпадках павінны фармавацца тут. Нельга тых адносін успрымаць прынагодна і цырыманіяльна...

Прэтэнзіі не па адрасу ☞ 2

Васіль Сакоўскі

Не ўспелі яшчэ як след выйсці з-пад расійскай апекі, як хутчэй адразу зноў інтэгравацца. Нават разлічваюць на стратэгічнае спонсарства Расіі... Аднак хрэновым спонсарам аказаўся Валодзя. Не памагла ні традыцыйная славянская дружба, ні беларуская кроў багата пралітая за маскоўскія шаленствы...

Інтэрнэт на хвалях ☞ 5

Аляксей Мароз

Віцэ-міністр паінфармаваў, што ягонае ведамства разам з гміннымі ўладамі і камп'ютэрнымі прадпрыемствамі будуць часткова фінансаваць падключэнне камп'ютэраў жыхароў Чыжоў да Інтэрнэту з выкарыстаннем радыёхваляў. Будзе гэта эксперыментальная інвестыцыя, якая яшчэ не рэалізавалася ў Польшчы...

Святкавалі 1 Мая ☞ 5

Уладзімір Сідарук

У чыгуначнай Чаромсе працаўнікі дзяржаўных устаноў збіраліся зранку на месцы працы. Затым ішлі пад клуб „Калеяж”. У 9[30] слухалі выступленне ў прамым радыёэфіры І сакратара ЦК ПАРП. Парадкавая служба фармавала калону першамайскага шэсця...

Пушчанская Аркадыя ☞ 9

Аляксандр Вярбіцкі

Прафесар Ежы Нікітаровіч з Беластоцкага універсітэта заўважыў, што не адна экалогія з'яўляецца каштоўнасцю, але і асяроддзе, створанае чалавекам: мова, традыцыі, абрады. Настаўнікі не прыстасаваны да працы ў шматкультурным асяроддзі, а здараліся і такія выпадкі, калі дырэктар школы, актывіст БГКТ, забараняў сваім вучням карыстацца ў школе роднай мовай...

18 гадоў Чарнобыля ☞ 10

Уладзімір Лапцэвіч

Успамінаючы той красавіцкі дзень 1986 года, калі я быў яшчэ падлеткам, прыгадваю незразумелыя для мяне размовы ў сям'і, што нешта дзесьці адбылося. Мой дзед, які амаль штодня слухаў „Голас Амерыкі”, казаў, што амерыканцы распавядалі аб выбуху на атамнай электрастанцыі недзе на Украіне...

9 770546 196000

Застой у адносінах да Беларусі

— Польшча і Еўрасаюз павінны падрыхтаваць на працягу найбліжэйшых двух гадоў шматгадовую праграму развою ўсходніх зямель ад Беластока па Пярэмышль, — намаўляў да гэтага ў сталіцы падляшскага рэгіёна віцэ-прэм'ер, старшыня сеймавай еўрапейскай камісіі Юзаф Алексы. Да сваіх канцэпцый пераконваў на дзень да выбару яго на маршалка Сейма, у час прэс-канферэнцыі „Развой усходніх рэгіёнаў — шанцы пасля ўваходу ў ЕС". Сарганізавалі яе на эканамічным факультэце Беластоцкага універсітэта.

Гаворка аб тым, што на працягу двух гадоў узнікне спецыяльная еўрасаюзная фінансавая агенда, якая намеціць прынцыпы, мэты і напрамкі фінансавання расшыранага Еўрасаюза аж да 2014 года. Якраз па тыя грошы, незалежна ад іншай падтрымкі, напр. з рэгіянальных фондаў, варта працягнуць руку. Праблема, аднак, у тым, што ў Бруселі, на што, дарэчы, звярнуў увагу Алексы, няма перакананння ў тым, што павялічаны ЕС ахопіць увесь убогі пояс на ўсход ад Віслы. Пакуль што, невядома таксама, хто меў бы гэтую праграму апрацоўваць, паводле якіх еўрасаюзных крытэрыяў.

Юзаф Алексы выказаўся абачліва:

— Беласток — добрая сталіца для гэтай ідэі...

Польшча пераконвае таксама ЕС да сваёй канцэпцыі ўсходняй палітыкі, у рамках дакумента „Усходні маштаб", адменнага ад еўрасаюзнага.

— Не хочам ніякай заслоны, нават блакітнай. Адносіны з Усходам павінны быць трактаваны Польшчай прыярытэтна, а ў шмат якіх выпадках павінны фармавацца тут. Нельга тых адносін успрымаць прынагодна і цырыманіяльна, — пераконваў былы прэм'ер.

Дык як адносіцца да Беларусі, Расіі ды Украіны? Як пераконваў Алексы, без дыдактычнай нахабнасці.

— Нельга таксама бачыць Польшчу як памост, паколькі кожная з гэтых дзяржаў хоча непасрэдна фармаваць свае адносіны з Бруселем. Мы павінны больш размаўляць і быць аўтарскімі ў адносінах да суседзяў.

У сваю чаргу ЕС дагэтуль мае праблемы з вызначэннем свайго стаўлення да Беларусі. Алексы не таіў:

— Еўрасаюз у адносінах да Беларусі пакутуе разумовым застоем. Польшча і ЕС не маюць ніякай канцэпцыі, як наконт гэтай справы рушыць уперад. Асоба прэзідэнта Лукашэнкі паралізуе. А мы ж фармуем адносіны да Беларусі, а не да прэзідэнта.

Распытваны больш „Нівай" аб тым, ці ў такім выпадку ЕС будзе трактаваць эканамічна слабую і ўбогую ў натуральныя рэсурсы Беларусь выключна як рынак збыту, Юзаф Алексы адказаў:

— Еўрасаюз гэта не толькі рынкавая супольнасць. Гэта супольнасць ідэй і людзей. У яе якраз варта Беларусь уключыць.

Гэтыя словы сёння гучаць досыць абстрактна. У ЕС іншыя праблемы, якія кранаюць непасрэдна членскіх дзяржаў. Юзаф Алексы сам заўважыў:

— Еўропа — сытая і багатая, але вялая, калі справа ў новаўвядзеннях і перасацыялізаванні.

фота: www.wrotapodlasia.pl

Мацей Халадоўскі

Прэтэнзіі не па адрасу

У 14 нумары „Нівы" ад 4 красавіка гэтага года быў змешчаны артыкул „Дзень закаханых у Пуціна" Віктара Сазонава з Гродна. Я не згаджаюся з поглядамі аўтара гэтага артыкула. Яго прэтэнзіі аднабаковыя, часта смешныя і не па адрасу. Асноўная пагроза для незалежнасці Беларусі знаходзіцца не ў Расіі, а ў самой Беларусі і беларусах. І ўсім гэта вядома, толькі не беларусам.

Яна, бедная сіротка, ніяк не навучыцца карыстацца сваёй незалежнасцю. І столькі ўжо гадоў траціць свае сілы і энергію то на перапрацоўку сваёй Канстытуцыі, то на барацьбу з беларускай мовай і беларускасцю, то на замену сваіх гістарычных сімвалаў, то на ўмацаванне даўно аджыўшага свой век калгаснага строю. Ён, зрэшты, ніколі не стаяў там на нагах, а толькі на галаве. Нават тыя гаспадаркі, якімі кіравалі будучыя прэзідэнты...

Калі ўсе постсавецкія дзяржавы энергічна ўшаноўвалі сваю самастойнасць і эканамічную незалежнасць ад Расіі, адбудоўвалі сваю нацыянальную культуру, годнасць, заключалі карысныя і бяспечныя саюзы, Беларусь наадварот.

Не ўспелі яшчэ як след выйсці з-пад расійскай апекі, як хутчэй адразу зноў інтэгравацца. Нават разлічваюць на стратэгічнае спонсарства Расіі... Аднак хрэновым спонсарам аказаўся Валодзя. Не памагла ні традыцыйная славянская дружба, ні беларуская кроў багата пралітая за маскоўскія шаленствы.

І гэтым самым Беларусь, здаецца, праспала свой шанц. Цяпер, хутка ўзрастаючая ў сілу Расія, пастараецца не выпусціць са сваіх кіпцюроў, быццам, незалежную Беларусь. Хаця што гэта за незалежная дзяржава — без сваёй мовы, без свайго нацыянальнага школьніцтва, без сваіх гістарычных сімвалаў, без..., без..., без...

І пра гэта аўтар артыкула ні гу-гу. У яго вінаваты ва ўсіх беларускіх грахах толькі Пуцін і расіяне. А беларусы не меланхолікі, і чыстыя, як крышталь. І з гэтым, канешне, згадзіцца не можа.

Абражаецца аўтар на расіянку, якая стаўшы жонкай беларуса і пражываючы ў Беларусі, надалей чуецца расіянкай, не хоча замяніць рускае грамадзянства на беларускае. Ды яшчэ і падсмейваецца над беларусамі.

Пара ўжо ведаць і нам, беларусам, што нацыянальнасць гэта штосьці важнае, святое і яе нельга мяняць пры кожнай нагодзе. І гэтая беларуская расіянка ведае аб гэтым. Малайчына. А што падсмейваецца над беларусамі — таксама не дзіва. Бо як жа ж над імі і не смяяцца, калі яны сваёй мовай не карыстаюцца, сваёй гісторыі, культуры, традыцый не шануюць і не ведаюць. Свае святасці і сваіх нацыянальных герояў топчуць?! Быць можа і муж расіянкі — беларус-меланхолік. І больш радуе яго, што парадніўся ён з вялікім рускім народам, як свая беларускасць.

Далей аўтар піша: „Беларусам даўно зразумела, што хто б не прыйшоў да ўлады ў Крамлі, сітуацыя ў бліжэйшы час кардынальным чынам не зменіцца. Наша галоўная задача — адмежавацца ад палітычнай ідэалогіі ўсходняга суседа... Уся гісторыя беларуска-расійскіх дачыненняў пацвярджае гэта...".

І дзякуй Богу, што нарэшце і беларусы зразумелі. Але ці ўсе яны зразумелі? І чаму так позна?!

Ці вам было яшчэ мала магіл маладых вашых хлопцаў (былых салдат і афіцэраў) на вашых і чужых могільніках? І няшчасных калек з, быццам, мірнага часу? Дзеля чаго, скажыце, яны кроў пралівалі і свае маладыя жыцці аддавалі ў Афганістане і іншых так званых гарачых кропках за тысячы кіламетраў ад роднай Беларусі?! Чыіх інтарэсаў там пільнавалі?! Бо, напэўна ж, не беларускіх.

Беларуская прастора, яе рэсурсы і хлопцы ой як патрэбныя сучаснай Расіі. Паявіліся там клопаты і з наборам сваіх хлопцаў у армію. Многія з іх проста не хочуць паслужыць у роднай арміі і выкупляюцца ад яе або выязджаюць за граніцу. Дзеці і ўнукі высокага расійскага чынавенства ўжо традыцыйна з маладых гадоў вучацца, а потым працуюць у заходніх краінах. А іх равеснікаў з народа прамой наводкай у Чачню і ёй падобныя мясціны. А што такіх мясцін не памяншаецца, а ўсё большае і большае, назарэз патрэбная матушцы Расіі яшчэ ціхая, спакойная беларуская тэрыторыя і надзвычай спакойныя, цярплівыя і верныя Расіі беларускія людзі і ў асноўным вайсковыя хлопцы. З дзесяці мільёнаў беларусаў набярэцца іх нямала і можна будзе заткнуць імі многія гарачыя дзіркі. Вось вам і ўвесь сэнс інтэграцыі па-расійску. Ураа!!!

Васіль Сакоўскі

Заўвагі аб нудзе

Гэта як карцінка, якую ты дастаў з-пад сэрца. Як моцна, як дакладна памятаю нутро дома, у якім, здаецца, дрыжыць распыленае святло папоўдні. Даганяе мяне трэск прычыненых дзвярэй, абмінаю пляму вады з перакуленага вазона з кветкамі. У шчыліне паміж дошкамі пабліскаве штосьці быццам сляза, можа, ртутная кропля. Здаецца, маятнік насценнага гадзінніка адхіляецца толькі ў адзін бок. Нуда, слодыч нуды падшытая неспакоем. Як доўга мне кружыць вакол уласнае восі. Мне ж неабходна дапісаць ліст, якога аркусік бялее на стале пад акном з відам на сад. Хопіць нанізаць на ніць мовы два, тры сказы. Мушу сцерці з люстра пыл. Мушу перакапаць у агародзе градку пад кветкі. Варта, так ці не, зрабіць што-небудзь, каб адчуць паўнату жыцця. Таму раблю штосьці, быццам скачу ў адхланне.

„Нуда, што чакае нас у будучыні, страшнейшая чым цяперашняя. Сённяшнясць гэта жыццё прыемна невыноснае", — заўважыў выбітны румынскі мысліцель Эміль Чыёран. Нуда Чыёрана — мастацкая, паэтычная. У чалавека, які працуе, заняты, забеганы, заклапочаны штодзённасцю — няма часу на нуду.

Не было часу на нуду, як заўважаюць антраполагі, у чалавека традыцыйных грамадстваў, першабытных, якога экзістэнцыя была прасякнута боскасцю, сакрумам.

Нуда як пляга з'явілася ў сучасных грамадствах, калі ў часапрасторы, якая стала лініяй часу што прабягае з мінулага праз сучаснасць у будучыню, дайшло да падзелу на час працы і час адпачынку.

Нуда і прыналежная ёй нецярплівасць — недамаганне некаторых кругоў інтэлігенцыі, асабліва той прафанскай, фанабэрыстай, якая пярэчыць Богу і прысутнасці святога ў жыцці.

Польскі пісьменнік і падарожнік Рышард Капусцінскі ўспамінае, як у час сваіх шматлікіх вандровак па свеце не адзін раз крануўся смерці. Пагрозай заўсёды былі ідэйнікі, фанатыкі, якія бачаць свет без адценняў, у колерах чорным ды белым. А знаходзіў выратаванне і супольную мову з людзьмі непадатлівымі пад уплывы ідэалогіі, — былі яны проста чалавечныя.

Нуда даводзіць да таго, што шукаюцца ў нашым свеце з'явы крайнія, якія распальваюць, дражняць вытанчаныя нервы. Анархісты і бальшавікі, нацысты, ісламісты — іх стаўленне абгрунтоўвалі інтэлігенты, інтэлігенты станавіліся іх правадырамі. Незалежна ад катастрофы XX-вечнага камунізму, марксісцкая ідэалогія, асабліва на Захадзе, трымаецца зусім няблага. Прапаведуюць яе адукаваныя і заможныя людзі, таму называюць іх зларадна шампанскімі сацыялістамі.

Далучэнне да крайніх рухаў, якія прапануюць бедным людзям на гэтай зямлі лёгкую развязку ўсіх праблем — а рухі тыя заблытаныя ў барацьбу за дамінацыю, за ўладу — здрада задачы інтэлігента. Тая задача — цярплівае тлумачэнне спраў такіх цяжкіх, як складаны лёс чалавека пад небам.

Ежы Плютовіч

У час апошняга перапісу насельніцтва 81,33 працэнта жыхароў гміны Дубічы-Царкоўныя назвала сябе беларусамі...

Ну, у Еўрасаюз...

[1 ☞ працяг]
дах. Хто збіраецца на беларускі дэкламатарскі конкурс „Роднае слова” ў Гайнаўку, хто на спартыўныя спаборніцтвы ў Свінароі, а яшчэ хто спяшаецца ў пушчу, каб з расой насаджваць дрэўцы.

Ёсць і асаблівая група. Сёння ў школе Першыя журналісцкія курсы для дзетак. Прыдумалі іх дзелавітыя настаўніцы: Галіна Трашчотка і Бажэна Маркевіч. Нядаўна, па іх ініцыятыве, праходзіў этна-спартовы турнір „Тут наш дом”. Раней настаўніцы самыя здабылі сродкі на мерапрыемствы.

— Тэмы па журналістыцы цяпер праходзім у школе, — кажа Галіна Трашчотка, беларусістка і паланістка. Сярод школьных журналістаў за дваццаць дзетак і гімназістаў.

— Наша газета будзе пісаць пра школу, — інфармуе галоўны рэдактар „Школьнага дэ бэста” Магда Аўксецяюк.

Адам Гуральчук, рэдактар канкурэнтнага „Красавіка”, хоча пісаць пра гмінныя справы. За ўзор — наша „Ніва”.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Плячыма да Еўрасаюза?

За два дні ўзнікнуць дзве беларускія газеты. Моладзь не баіцца Еўрасаюза, таму без насцярожанасці і хвалявання запіша настрой на два тыдні да гістарычнага моманту.

Пасля абеду большасць польскамоўных журналістаў пачынае азывацца на дыялекце.

— А ў хаце як размаўляеце, — пытаю Моніку, Лешка і Хрыстафора, з якімі ходзім па хатах і пытаем пра буслоў.

— Ну, па-свойму, — кажуць неяк канспіратыўна.

Карова важнейшая за гаспадара

У пункце скупкі жывёлы многа земляробаў з наваколля.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Маладыя журналісты распытваюць пра Еўрасаюз

— Я быў і ёсць супраць Еўрасаюза, — заяўляе Пятро Галімскі, земляроб з Ягаднікаў.

Найбольш хвалюе яго бюракратыя і еўрарамонт у аборы. А найгоршае ліха з керамічнымі пліткамі, якія трэба пакласці ў даільным участку.

— Бо і ў хаце не ўсе маюць „кафэлькі”, — хвалююцца сяляне. Чалавек перажывае шок, што карова важнейшая за яго!

— І ці будзе прыбытак з пчалаводства, — гадае Пятро Багроўскі з Руткі, мой знаёмы са студэнцкіх часоў, — а як навалакуць нейкага таннага мёду з Аўстраліі?

Пятро таксама паўтарае мясцовыя жахі:

— Ці не будзе як за акупацыі — каб закалоць свінчо, мабыць, прыйдзецца мяшок на лыч закідаць, каб ніхто віску не пачуў.

Жонка Эля найбольш хвалюецца за будучыню дзяцей:

— У мяне ў *склепе* ліквідуюць штат, я патрачу працу. Сёлета дачка канчае гімназію, праз год другая. І як тут дзяцей вучыць.

Пра карыстанне са стыпендыяў і фондаў у гміне ведаюць адзінкі.

У гміне ўжо па-англійску

— Would you like a drink? — вітае войт Анатоль Паўлоўскі.

Усе працаўнікі гміны рыхтуюцца да новага, ходзяць на курсы англійскай мовы. Бо можа нехта прыедзе з Захаду і захоча тут жыць. Ужо цяпер дзейнасць мясцовага Дома культуры ў асноўным зводзіцца да турызму ля вадасховішча Бахматы.

— To dobrze, że chcecie pisać do gazety po swojemu, — пачынае войт. Як дыпламат, найперш хваліць — пасля лае. Гэта за мой крытычны артыкул, які таксама найшлі ў Інтэрнэце. Пра дубіцкую школу і войта.

Пра мову наведвальнікам гміны расказвае Вольга Рэпка:

— Старэйшыя людзі больш карыстаюцца свойскай мовай, малодшыя — польскай.

Спадарыня Рэпка ўспамінае смешнае здарэнне.

— Прыехала да нас кантралёрка, а да мяне якраз прыйшоў пажылы і глухаваты дзядзька, і ні ў зуб не гаварыў па-польску. Тая кантралёрка не магла надзівавацца, што чужынец прыйшоў без перакладчыка, чаго ў іх не бывае...

На пытанне: а ці хацелі б вы, каб афіцыйнай мовай была і беларуская, — можа пасыпацца даклад пра „нацыяналізм”. Папраўдзе, зацвярджэнне мовы нацыянальнай меншасці палохае не менш як смерць парсюка з пашпартам!

У час апошняга перапісу насельніцтва 81,33 працэнта жыхароў гміны назвала сябе беларусамі.

А канкурэнцыя не спіць!

— У былым гэсаўскім магазіне далятае беларускае дыска-пола, карацей — спявае гурт „Ас”. Два кліенты з півам у руцэ падтупваюць у рытм шэдэўра: „Цябе айчына забыць я не магу...”

— Ці ў вас можна набыць касеты з беларускай музыкай, — пытаю прадаўшчыцу.

— Гэта толькі на нашы патрэбы, — адказвае спадарыня за прылаўкам і дадае: — Нядаўна заехалі да нас нейкія, пакруціліся, паслухалі нашай музыкі і пытаюць: „To u was nikt po polsku nie mówi?” — „A ja to po jakiemu do was teraz mówię?” — упікнула іх *склепова*. І патлумачыла: — Хто іх там ведае, адкуль такія? Можа са Шлёнска? Выглядалі на страшэнна перапітых.

— Цяпер людзі жывуць бедна, многія купляюць „на крэску”, — чую нараканні. Прыбытак для магазіна жахліва панізіўся, калі ліквідавалі секцыю з манапольнай. — А канкурэнцыя не спіць, *рускія* ўжо ў шэсць раніцы з „Раялам” пад малачарняю стаяць.

У бары, які ў народзе завуць „пуб” — пустэча. Лысы бармен за прылаўкам аглядае тэлебачанне. Пуб ажывае вечарам і летам.

У Дубічах кажуць, што там ужо даўно Еўрасаюз. Карацей, час ад часу прыязджаюць сюды дзяўчаты з секс-сервісу.

— Да чаго давядзе Еўрасаюз? Да катаклізму! — хвалюецца Яўген Кірылюк, уласнік крамы „Далікатэсы”, што насупраць парку і помніка савецкаму байцу.

— Усё зарасце лесам і травой. Гаспадароў не будзе. Тыя што астануцца, палягаюць летам над вадасховішчам Бахматы і будуць абмяркоўваць як зарабіць грошы і не нарабіцца.

Бо свойскі хлеб найлепшы

Еўрасаюза не баіцца найстарэйшая жыхарка Дубіч-Царкоўных, 93-гадовая Зіновія Гіль.

Бабуля, не выязджаючы з вёскі, жыла пры цары, санацыі, пры саветах, немцах, Народнай Польшчы, „Салідарнасці” і зараз... Еўрасаюз ёй не навізна!

Старажылка не разбіраецца ў палітыцы, але можа падказаць рэцэпт на доўгае жыццё.

— Трэба многа працаваць і не баяцца Еўрасаюза, — кажа, — хто захоча багацця — паедзе ў свет. А тыя, што астануцца, таксама будуць жыць. Пачнуць пячы свойскі хлеб, а свойскі хлеб найлепшы!

Фота БАЖЭНЫ МАРКЕВІЧ

Ці свойскага хлеба дастаткова, каб заваяваць Еўропу?

Ганна Кандрацюк

У рэпартажы скарыстаны артыкулы з газетак „Школьны дэ бэст” і „Красавік”, якія ўзніклі ў час I журналісцкіх курсаў у Дубічах-Царкоўных у днях 16-17 красавіка, пад кірункам настаўніц: Галіны Трашчоткі, Бажэны Маркевіч, Ніны Добаш-Карпюк, Міры Сіроцкай-Тваруг і аўтаркі рэпартажу.

Святочныя пакункі

Вёску Бялкі і іншыя навакольныя вёскі, што ў Нарваўскай гміне, наведваюць шматлікія аб'язныя крамы з Нарвы, Заблудава, Кур'янаў, Беластока і Гайнаўкі. Усе яны ў перадсвяточны перыяд былі вельмі добра абяспечаны ўсялякімі харчовымі прадуктамі. Былі нават свежыя агурочкі, памідоры, розныя мясныя вырабы ды салодкае пячэнне. Адным словам — усялякая ўсячына. Але найлепш абяспечанай у святочныя прадукты была аўтакрама з Нарвы — у ёй быў вялікі выбар пасхаў з велікодным „Хрыстос Уваскрос" для праваслаўных вернікаў і „Wesołego Alleluja!" — для каталікаў. І за гэта ўсе пакупнікі шчыра дзякуюць спадарыні Веры Кірылюк, уласніцы пякарні ў Нарве.

Цікава будзе праз год святкаваць Вялікдзень, калі будзем ужо ў Еўрасаюзе. Ці стрымаюць еўрасаюзныя нормы гэтыя аўтакрамы, ці старэчам пенсіянерам прыйдзецца ісці пешкі ў Трасцянку, каб купіць пасху і радавацца Хрыстовым Уваскрэсеннем.

Мікалай Лук'янюк

Паўвека разам

У ЗАГСе ў Міхалове (Беластоцкі павет) уручылі медалі за шматгадовае шлюбнае сужыццё, якія прысвоіў прэзідэнт РП. Атрымалі іх сужонствы: Казімір і Яніна Багдановічы, Станіслаў і Леакадзія Храноўскія, Ян і Ірэна Чабаны, Ян і Марыя Грыкі, Юзэф і Марыя Кардашы, Мікалай і Анастасія Матрэнчыкі, Рышард і Браніслава Мараўскія, Мікалай і Вера Назаркі ды Сяргей і Людміла Трахімчукі.

Падчас урачыстасці шаноўных юбіляраў павіншавалі войт Міхалоўскай гміны Марэк Назарка, старшыня Рады гміны Тадэвуш Бобэль, сакратар гміны Станіслаў Малясінскі і кіраўнічка ЗАГСа Зофія Верабей. Віншаванні і кветкі былі і ад гмінных улад, і ад дзяцей, унукаў і праўнукаў. Затым паплылі ўспаміны пра тое, як сённяшнія юбіляры ў свае маладыя гады пазнаёміліся, дзе і ў якую пару года вянчаліся і як тады спраўлялі вяселле. Яны ахвотна расказвалі пра сваіх дзяцей і ўнукаў. **(яц)**

Хлеб

Хлеб наш надзённы, хоць чэрствы, але смачны. Але пасля 1 мая, калі Польшча стане членам Еўрапейскага Саюза, чэрствага хлеба не будзем есці. Непрададзены хлеб на другі дзень трэба будзе выкідаць. Гавораць, што па загадзе Еўрасаюза чэрствы хлеб прыйдзецца спальваць у печы. Так гэта брусельскія чыноўнікі дбаюць пра наша здароўе.

Калісь мая маці і бабуля пяклі хлеб кожныя два тыдні — на хрэнавым лісці. І цэлыя два тыдні елі мы яго і быў ён смачны. Цяпер купляю пратэрмінаваныя, уцэненыя напалову булачкі, бо пры малой пенсіі не магу сабе дазволіць на раскошнае жыццё. Але ад мая — стоп! Не будзе можна прадаць або аддаць каму чэрствага печыва, толькі прыйдзецца знішчаць яго.

Дзядзька Захар

За павільёнам міні-скансэн з дзвюма традыцыйнымі мясцовымі хатамі. І стадола, якая мае стаць часткова дзейным музеем. Некаторыя экспанаты будуць толькі паказвацца, але на некаторых...

Каб не кідалі роднага

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Гаспадары ў адным з гасцінных пакояў

Сядзіба спадарства Казлоўскіх на новаляўкоўскім хутары, які сёння апынуўся на прамежку поля між маладымі лясамі, што прасцерліся паміж Нарвай і Баброўкай, ды сенажаццю ад гэтай апошняй рачулкі. Згаданыя лясы выраслі невыпадкова: карміліца-зямелька там небагатая, давала небагаты сельскагаспадарчы ўраджай, таму і пайшла пад аблясенне, даючы сёння неблагі плён грыбоў. А людзі?.. Старэйшае пакаленне жыхароў суседніх Лазовага і Новін ды іх наваколля адправілася на недалёкія могілкі, а большасць малодшага пакалення разляцелася ад родных ніў шукаць хлеба па розных выраях. Прабаваў і спадар Барыс Казлоўскі скаштаваць нейкай больш ці менш адлеглай экзотыкі, але ўсё ж такі прычаліў на бацькаўшчыну.

Працаваў у эскаэры, меў пад сабой склад запчастак. Паедуць дастаўшчыкі па тавар, праматаюць яго яшчэ ў дарозе, а на ўлік склада трэба прыняць тое, чаго ўжо ў наяўнасці няма. Падлік выявіў бракі на складзе, давялося мець справу з пракурорам, судом...

— Гавару ім: калі я стаў на працу, прыняў васемнаццаць трактароў, а калі адыходзіў, пакінуў у эскаэры дзевятнаццаць, ніводнага не купляючы — я ж гэты лішні мог забраць сабе. Ну, як доўга мог трымацца ў нашай краіне такі эканамічны строй?..

Трымалі Казлоўскія кароў, купілі ад „рускіх" цэнтрыфугу, сталі самыя вырабляць малочныя прадукты. Яшчэ ад семярых суседзяў бралі малако і смятану з сырамі вазілі ў Гайнаўку прадаваць. Бывала, што шэсцьдзесят „клінкоў" за адзін раз завозілі і ўсё сходзіла. Але людзі сталі бяднець, штораз менш было пакупнікоў, бізнес згортваўся.

Прадалі кароў, сталі займацца вырабам намагільных помнікаў і бетонных бруской „польбруку" для іх абкладкі. Было крыху заказаў, але колькі гадоў можна займацца такой цяжкай працай? Час жа паволі адбірае і здароўе, і сілы.

Сталі думаць пра будучыню, падумалі аб агратурызме, спалучаным з прыродалячніцтвам. Знаёмы лучан расказаў, што ў ягонай маці вырадзіліся суставы, не магла хадзіць, хаця вазіў яе да розных спецыялістаў. І адзін стары лекар параіў загортваць яе ў гарачы пясок на пляжы, праз два тыдні. Мінула дзесяць дзён і жанчына стала хадзіць. І задумалі пра гарачыя пяскі, пра паравыя лазні і ванны з прымяненнем навараў з сена, аўсянкі, яловай іглічы. Калі што другі дзень праз паўтары гадзіны парыцца і звыш дваццаці мінут мачыцца ў такой вадкасці, каб цэлы чалавек акунуўся, дык пасля чатырох-пяці працэдур перастае круціць у нагах і чалавеку вяртаецца нармальны сон.

Аднаму чалавеку адняло палец, сталі яго парыць пацярухай з сена: пасля месяца стаў палец варушыцца. Пра паранне ног у солі меркаванні разыходзяцца, а вось калі парыць у сене, тады ўсе нечысці кровазвароту распарваюцца, а крывяносныя сасуды расчышчаюцца.

Людзі цікавяцца гэтым, але паволі. Прывязуць бабульку намагільны помнік заказваць; ды не за тры тысячы хоча, але прынамсі за шэсць тысяч злотаў. Я прапаную каб паспрабавала падлячыцца нашымі працэдурамі, а яна пытае, колькі гэта будзе каштаваць. Калі кажу, што трыццаць злотаў, круціць галавою, што задорага...

Два ложкі з падаграваным пяском задумалі мы зрабіць зараз за кухняй, каб правесці туды медныя трубкі з цёплай вадой пад дно, на якое мелі насыпаць пясок. Але санінспекцыя мела да кухні засцярогі і трэба яе разбудаваць, таму тэрмалячэнне пяском адтэрміноўваем да часу, калі разбудуем наш гасцінны павільён. Працэдура ў пяску павінна доўжыцца два тыдні, а пасля пясок мяняецца. Пясок у нас свой, беленькі, чысты: такі быў пад ставамі і пад студняй.

Неўзабаве працягнуць да нас водаправод, але мы сваю студню выкапалі з крынічнай вадой. Укапалі шэсць бетонных кругоў; вада выступае адзін круг пад зямлёй. І калі нават быў 25-градусны мароз, вада тая не замерзла, аднойчы толькі прышэрхла.

Пабудавалі ўласную экалагічную ачышчальню вадкасцей. Выкапалі два ставы для рыб, глыбокія, для якіх прывезлі шаснаццаць фур вярбы на фашыну, каб берагі не абсыпаліся.

Вельмі важным гаючым сродкам з'яўляюцца торфамінералы (баравіна), якія на Імшары каля Міхалова знаходзяцца 60 метраў пад паверхняй зямлі і іх выпампоўванне сёння там па эканамічных прычынах спынена. Гэтае рэчыва вельмі багатае мікраэлементамі, якія праз цёплыя абклады ўводзяцца ў арганізм; шкада, што гэтае багацце нашай зямлі прыходзіцца купляць у аптэках.

Маем 8 гектараў зялёных угоддзяў, з чаго амаль 5 гектараў пад сенам. Сена для ваннаў перацярушваем першы раз, каб пясок адышоў, а пасля яшчэ раз перасейваем.

У будучыні ваду, якая астанецца пасля азаніруючых працэдур, думаем прымяняць для палівання тэніснага корта, які хочам пабудаваць на палетку побач нашай хаты; гэта не надта складаная інвестыцыя. Побач наладзім зацішнае і бяспечнае месца для вогнішча. Тут ціха, адно шпакі могуць раніцай будзіць, не тое што ў Белавежы, дзе маса людзей і схадзіць можна найчасцей у такія месцы, што і ў кожным горадзе.

У гасцінным павільёне, разлічаным на шаснаццаць чалавек, апрача згаданай кухні, азоннай ванны і паравай лазні, ёсць некалькі двух- і чатырохмесых пакояў з двухярусными драўлянымі ложкамі ўласнай канструкцыі з эрганамічнымі і экалагічнымі какосавымі матрацамі.

За павільёнам міні-скансэн з дзвюма традыцыйнымі мясцовымі хатамі. І стадола, якая мае стаць часткова дзейным музеем. Некаторыя экспанаты будуць толькі паказвацца, але на некаторых можна будзе папрактыкавацца ў колішняй працы селяніна. У музеі не будзе паркетаў, затое будзе кавалак току, на якім можна будзе ўзяць цэп і змалаціць некалькі снапоў збожжа. Тое зерне можна будзе правеяць і веялкай, і шуфелем. І змалоць на муку можна будзе ў жорнах. І спячы блін у рускай печы. Будзе можна прасачыць увесь цыкл прадукцыі хлеба... І стойкі для трачавання бярвення — вядома, адпаведна забяспечаныя парэнчамі... І прыстасаванне для рэзання камянёў... Пакуль — хопіць пералічваць.

Гаспадар, праводзячы мяне, згадвае і пра прыродную асаблівасць: у маладым лесе побач хаты вырас мутант елкі і хвоі — ствол яловы, шышкі сасновыя, іголкі пасрэдныя...

Я быў крышку пасумняваўся, ці спадарства Казлоўскія наступаюць не надта шырокім фронтам, ці госці ў іх не разгубяцца і ці яны самі справяцца з усім гэтым. У адказ пачуў, што госці зусім не абавязаны разгубляцца ў такім зацішным месцы. А той шырокі фронт і стварацца дзеля таго, каб арганізаваць тут будучыню сваім дзецям і нашчадкам сваіх суседзяў. Каб яны не кідалі роднага і не ехалі ў чужыну за хлебам, але каб на родным аставаліся, бо і ў нас ёсць прыцягальныя рэсурсы, маем што паказаць і, заміж саромецца, маем чым ганарыцца.

Аляксандр Вярбіцкі

Інтэрнэтавая прапанова

На спатканне з намеснікам міністра навукі і інфарматызацыі Войцехам Шэўкам, якое адбылося 20 красавіка ў Комплексе школ у Чыжах, прыбылі настаўнікі, моладзь і жыхары Чыжоўскай гміны. Сяляне прыйшлі пазнаёміцца з прапановай міністэрства і гмінных улад наконт куплі камп'ютэраў і пастаяннага падключэння іх да Інтэрнэту. Віцэ-міністр Войцех Шэўка паінфармаваў, што ягонае ведамства разам з гміннымі ўладамі і камп'ютэрнымі прадпрыемствамі будуць часткова фінансаваць падключэнне камп'ютэраў жыхароў Чыжоў да Інтэрнэту з выкарыстаннем радыёхваляў. Будзе гэта эксперыментальная інвестыцыя, якая яшчэ не рэалізавалася ў Польшчы. Чыжавянам, у якіх няма камп'ютэраў (ёсць яны толькі ў некаторых малодшых жыхароў), прапануецца купіць новыя пры дапамозе двухгадовага крэдыту. Плануецца, што неабмежаванае карыстанне Інтэрнэтам будзе каштаваць ад 30 да 50 злотых у месяц. Віцэ-міністр прапанаваў, каб гмінныя ўлады часткова фінансавалі падключэнне да Інтэрнэту карыстальнікаў у іншых вёсках гміны і хадайнічалі аб сродкі на гэтыя інвестыцыі ў еўрапейскіх установах.

Віцэ-міністр Войцех Шэўка паінфармаваў, што на дамах тых жыхароў Чыжоў, якія рашацца падключыцца да Інтэрнэту, будуць мацаваць невялічкія антэны. З выкарыстаннем радыёхваляў будуць яны спалучаны са спадарожнікавай антэнай пастаўленай у цэнтры вёскі. Да вялікай антэны можна будзе падключыць да 200 камп'ютэраў. Адказныя за інвестыцыю лічаць, што акупіцца яна, калі ў Чыжах падключаных будзе 50-60 камп'ютэраў. Калі зацікаўленасць будзе яшчэ меншай, інвестыцыю больш актыўна могуць успамагчы гмінныя ўлады.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Карыстацца Інтэрнэтам заахвочваў віцэ-міністр Войцех Шэўка (стаіць; злева: войт Юрый Васілюк, старшыня Гміннай рады Валянціна Якімюк і дырэктар школы Міраслаў Пяткевіч)

Войт Юрый Васілюк абяцаў дапамагчы гаспадарам арганізавацца і фінансава падтрымаць інвестыцыю. Пасля сустрэчы гаспадары сталі абмяркоўваць новыя магчымасці.

На сустрэчу прыйшлі жыхары Чыжоў і наваколля

— Будуць маладыя, якія схочуць карыстацца Інтэрнэтам, — лічыць солтыс Чыжоў Андрэй Ціханюк.

— Напэўна доступ да Інтэрнэту патрэбны, але ў нас мала маладых гаспадароў, якія схочуць купіць камп'ютэры. Мне асабіста і хочацца, і колецца. Дзеці ёсць і патрэбны будзе ім камп'ютэр, — сказаў малады гаспадар Васіль Гаўрылюк з Чыжоў. — З другога боку існуе небяспека, што маладыя будуць заглядаць на старонкі з непрыстойнымі фатаграфіямі. Аднак, маладых цяжка ўпільнаваць. Схочуць, то пойдуць да суседзяў і там будуць заглядаць у камп'ютэр.

— Я лічу, што Інтэрнэт патрэбны гаспадарам. Карыстаючыся ім можна будзе даведацца, якія ўгнаенні і сродкі аховы расліннасці трэба прымяняць, — тлумачыў Яўген Андраюк з Чыжоў. — Аднак, каб пазнаёміцца з усім гэтым, трэба часу. А ў сялян яго мала.

Кіраўнік Гміннага асяродка культуры ў Чыжах Юрый Якімюк паінфармаваў, што інтэрнэтавай кафейкай, якая ад лютага працуе ў мясцовай бібліятэцы, пастаянна карыстаецца 41 асоба. У іх ліку найбольш вучняў, але ёсць і старэйшыя чыжавяне.

Аляксей Мароз

Святкавалі 1 Мая

Пачатак траўня багаты гістарычнымі падзеямі. 1 Мая адзначалася як свята працы, а 3 Мая — як дзень устанаўлення Канстытуцыі. Сёлета пад датай 1 мая дадаткова запішацца ўступленне Польшчы ў Еўрасаюз. Гэта гістарычная падзея для III Рэчы Паспалітай і пэўна будзе запісана залатымі літарамі. Для левых дэмакратаў гэта гонар, бо пры іх уладзе адбываецца далучэнне да ЕС. Праўда, каманда Лешка Мілера 2 траўня падаецца ў адстаўку і гэта не нагода для святочнай выпіўкі, але хутчэй для адслужэння паніхіды. Не хачу прарочыць, як будзем адзначаць уваход у Еўрасаюз, але пры нагодзе ўспомню, як пры камуне адзначалася Першамайскае свята.

У чыгуначнай Чаромсе працаўнікі дзяржаўных устаноў збіраліся зранку на месцы працы. Затым ішлі пад клуб „Калеяж". У 9³⁰ слухалі выступленне ў прамым радыёэфіры I сакратара ЦК ПАРП. Парадкавая служба фармавала калону першамайскага шэсця, якое ўзначальваў духавы аркестр чыгуначнікаў. Затым ішла школьная моладзь з каляровымі шарыкамі, сцяжкамі ды штучнымі кветкамі, ад малечаў па старшакласнікаў. За імі дэлегацыі ветэранаў працы і вайны са сцягамі. Транспаранты з лозунгамі перамешваліся з бела-чырвонымі штурмоўкамі. Калона Першамайскай дэманстрацыі з-пад клуба „Калеяж" праз вуліцу Ліпавую ішла пад насычальню. Там на ганаровай трыбуне парад прымалі прадстаўнікі ваяводскіх, павятовых ды мясцовых партыйных улад, міліцыі, войска ды ветэранаў вайны. Там завяршалася афіцыйная частка першамайскага шэсця.

Варта адзначыць, што пасля дэманстрацыі пачыналі працаваць прадуктовая і манапольная секцыі магазінаў, у якіх можна было купіць гарэлку, каўбасу, хлебныя вырабы ды розныя напіткі. Гэта была сапраўдная нагода для святкавання не толькі для аматараў выпіўкі, але і для сямейных сустрэч. Адны раскладаліся ў сасновым лясочку побач насычальні, а іншыя пераносіліся на зялёную траўку ля сажалкі „Каганка", што знаходзілася непадалёк клуба „Калеяж". Увечары праходзілі танцы. На забаве гулялі да раніцы.

Пасля заняпаду камуны загінула традыцыя першамайскіх шэсцяў. Адно ў календары свята працы не адменена і надалей з'яўляецца выхадным днём.

Ці ўваход у Еўрасаюз нешта адменіць? Гэтае пытанне ставяць не толькі дарослыя, але і моладзь. Для тых апошніх гэта шанц (прынамсі так думаюць) на дадатковы рынак працы. Для пенсіянераў, беспрацоўных і работнікаў сельскай гаспадаркі — тупік. Праўда, у час апошніх парламенцкіх выбараў левыя дэмакраты абяцалі паляпшэнне долі працоўнаму народу, як і бяспечную краіну. Але каманда Лешка Мілера аказалася неверагоднай і 2 мая падаецца ў адстаўку. Ці СЛД зможа ўтрымацца пры ўладзе да канца кадэнцыі, дык цяжка сказаць. Стварэнне Маркам Бароўскім новай Сацыял-дэмакратычнай партыі паказала, як падзелена зараз СЛД.

Уладзімір Сідарук

Я таксама супраць!

Апошнім часам у сродках масавай інфармацыі вельмі часта можам пачуць ды прачытаць каментары адносна прысутнасці польскіх войскаў у Іраку. Водгукі на гэтую справу паявіліся таксама ў „Ніве".

Як свядомы свабоды слова грамадзянін дэмакратычнай дзяржавы шчыра і голасна гавару: „Не!!!" Не згаджаюся на тое, каб „нашы хлопцы гінулі за амерыканскую нафту!"... Гавару шчырае „Не!" па асабістых прычынах, бо праз гэтую ваенную кампанію чалавеку штодзённае жыццё можа проста абрыднуць. Вось, напрыклад, едзе чалавек на метро два прыпынкі, гэта звычайна 5 мінут дарогі, а тут аказваецца, што з-за тэхнічных прычын цягнік стаіць у тунелі 10 хвілін. Вядома, нехта пабачыў самотную сумку. Талібы!

Так, так, гэта ўсё праўда. Жыхары сталіцы жывуць у пастаяннай трывозе. Нейкі псіхоз. Ва ўсіх важнейшых месцах горада расклены інфармацыі (ад аўтобусных прыпынкаў да універсітэта), як паводзіць сябе ў выпадку „бомбавай пагрозы". У ёй можам прачытаць, між іншым: „Памятай, калі ўбачыш бомбу, яна бачыць таксама цябе" або „Калі бачыш пагрозу, ідзі адтуль як найхутчэй і інфармуй як найбольшую колькасць людзей". Вось і дапамога. Кожны без гэтага ведае, што ў выпадку пагрозы трэба ўцякаць і крычаць „бомба!" Але што ж. Лепшая такая дапамога, чым ніводная.

Дэманічная атмасфера адчуваецца ўсюды. Апошнім часам пачуў я пра чалавека, які спакойна сядзеў сабе ў інтэрнэтавай кафейцы. Працаўнікі кафейкі пабачылі, што лістае ён арабскія старонкі. Небыліца! Я таксама спалохаўся б, тым больш, што ён быў падобны да араба. Хутка прыехала паліцыя і затрымала тэрарыста. Ужо пазней аказалася, што гэта звычайны чалавек, які проста чытаў сабе арабскую газету!

Ад гэтага часу шырокім колам абмінаю інтэрнэтавыя кафейкі. Баюся, бо нехта гледзячы з боку таксама можа палічыць мяне арабам (у мяне зусім неславянскі колер скуры). Не ведаю таксама, ці буду гартаць старонкі, напрыклад „Нівы", бо нехта можа памыліць кірыліцу з арабскімі рагізулькамі. Ёсць таксама пагроза, што падляшскую гаворку могуць прыняць за мусульманскую малітву перад самагубнай смерцю. І вазьмі ты не бойся! Дажылі мы часоў, што вялікая палітыка дакранаецца непасрэдна да нас, малых.

Чалавек паўгода таму выехаў са спакойнага Бельска, а ўжо мусіць змагацца з тэрарызмам. Хацелася б сказаць, што не цікавяць мяне праблемы ўсіх Бушаў, нашых урадаў і каго там яшчэ. Але як яны могуць мне быць абыякавымі, калі з-за арганізаванага прэзідэнтам Гаспадарчага форуму цэнтр Варшавы будзе паралізаваны? На шчасце заняткаў у гэты час не будзе, бо я ўжо баяўся, каб не дастаць па галаве ад нейкага маньякальнага антыглабаліста.

Бачыце, як цяжкім стала наша жыццё з-за прысутнасці польскіх войскаў у Іраку: нікуды не даехаць, бо ўсюды „бамбяць". Гаварыць па-свойму страшнавата, бо тэрарыстам назавуць. Вучыцца таксама — куча антыглабалістаў пад бокам!

Таму яшчэ раз гучна гавару: „Не!!!" Я — супраць!!! Вось як я, Міхаська, „палітыканам" стаў.

Міхась Сцепанюк

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дубіцкія журналісты і настаўнікі ва ўрочышчы „Бахматы”

Красавіцкі дэ бэст!

У Дубічах-Царкоўных не ладзілі Еўрапейскага дня, але школа шыкоўна ўвайшла ў Еўрасаюз!

Тут 16-17 красавіка г.г. нарадзіліся дзве беларускія газеты: „Школьны дэ бэст” і „Красавік”. Аўтары — школьнікі і гімназісты, апантаныя стыхіяй спаборніцтва, працавалі дзень і ноч. Карацей, за два дні трэба было здабыць матэрыял, напісаць артыкулы і звярстаць газеты. Ды яшчэ суцяшаць малодшых сяброў, якім захацелася спраўляць „зялёную ноч”.

У выніку ўзніклі каштоўныя рэпартажы-партрэты жыхароў Дубіч і наваколля, размовы пра школу і вёску, пра абрады і традыцыю. І найважнейшае — маладыя журналісты запісалі настрой грамадства на два тыдні да ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз.

Апрача літаратурнай мовы дзеці карысталіся мясцовым дыялектам.

Було куль!

У ролі галоўных рэдактараў першакласна справіліся Магда Аўксецяюк і Адам Гуральчук. Першая, разам са сваім сакратаром Барбарай Трафімюк раней удзельнічалі ў Сустрэчах „Зоркі”.

Аўтарамі і арганізатарамі праекта з’яўляюцца настаўніцы — Галіна Трашчотка і Бажэна Маркевіч. Над працай школьнікаў назіралі таксама настаўніцы Ніна Добаш-Карпюк і Міра Сіроцкая-Тваруг.

Беларуская прэса ў дубіцкай школе мае сваю традыцыю, тут у мінулым пад рэдакцыяй Галіны Навумюк выйшла некалькі нумароў літаратурна-паэтычнага часопіса „Праменьчык”.

Трэба спадзявацца, што ідэю і магчымасці школьнікаў падтрымаюць гмінныя ўлады і атрымаецца прыстойная школьна-гмінная газета.

Ганна Кандрацюк

Еўрасаюз у школе

Дубіцкія гімназісты і настаўнікі выказалі свой погляд на Еўрасаюз. У першую чаргу мы запыталі пра іх спадзяванні.

Марыёла Гаеўская: — Напэўна не будзе лёгка. Як большасць моладзі, думаю пра універсітэт, пакуль недзе ў Польшчы.

Аня Кірызюк: — Я хацела б астацца на бацькаўшчыне і весці гасцініцу і рэстаран. Маю надзею, што змагу пакарыстацца сродкамі з Еўрасаюза. А калі мае планы не здзейсняцца, я з’еду ў пошуках працы за мяжу.

Лукаш Івацік, Каміль Сурэль: — Напэўна зменіцца школа, можа павысіцца ўзровень навучання замежных моў. Настаўнікі больш будуць ціснуць з гэтых прадметаў.

Славамір Кулік, настаўнік: — Гэта вельмі добра, што наша краіна ўступае ў Еўрасаюз. Зможам ездзіць за мяжу без пашпартоў.

Ці памяняецца навука ў школе? Можа атрымаем фінансавую падтрымку і будзем праводзіць дадатковыя заняткі; я маю тут на думцы не толькі пазаўрочныя гурткі для найлепшых, але і заняткі для вучняў, якія не спраўляюцца з навукай.

Паводле „Школьнага дэ бэста” і „Красавіка”

Школьнікі з Дубіч-Царкоўных плённа супрацоўнічаюць з „Зоркай”. У школе час ад часу выходзіць таксама газетка на польскай мове. Зараз асноўныя веды пра журналістыку моладзь засвойвае ў школе. У час нашых заняткаў многія дзеці ўпершыню спазналі радасць ад творчай працы на роднай мове.

— Ах, якія вы гожыя і простыя, — хвалілі дзяцей старэйшыя людзі, якіх чамусьці ўпадабалі нашы журналісты.

Церамкі

Церамкі — маленькая вёска ў гміне Нараўка. Паўстала яна ў XVIII стагоддзі. Пасяліліся ў ёй людзі, якія жылі з працы ў лесе.

Сваю назву вёска ўзяла ад першых, вельмі маленькіх дамоў, якіх па-руску называлі „теремками". Хаця першыя хаткі былі бедныя і вельмі маленькія, людзі адчувалі сябе тут як у сапраўдных палацах. Жылі як у адной сям'і і быццам на адным панадворку. З поўначы і поўдня ў вёску ўваходзілася праз дзве вялікія брамы, якіх сцераглі злосныя сабакі. Калі хтосьці чужы хацеў сюды прайсці, трэба яму было весці сябе вельмі асцярожна, каб не раздражніць гэтых сабак-вартаўнікоў.

Мужчыны з вёскі працавалі ў лесе, жанчыны займаліся хатнімі справамі, а дзеці — пасвілі коней, кароў і авечак.

Прадметы штодзённага ўжытку людзі выконвалі самі, бо ў іх не было грошай, а на дадатак — у вёсцы не было крамы.

У час другой сусветнай вайны праз вёску праходзілі групы галодных нямецкіх салдат. Жыхары вёскі вельмі іх баяліся, хаваліся самі ды хавалі ад немцаў сваю жывёлу. На шчасце, у вёсцы ніхто не загінуў. Аднак Церамкоў не абмінула пацыфікацыя — жыхароў перасялілі ў Беласток. Дамы згарэлі, а дабро было зрабавана. Пасля вайны людзі вярнуліся на сваю бацькаўшчыну і адбудавалі вёску.

На пачатку ў вёсцы было толькі 5 хат, зараз іх 6, пражывае тут усяго 14 чалавек. Мая сям'я — наймалодшая ў вёсцы, бо тут галоўным чынам пражываюць старэйшыя людзі. У школе вучуся толькі я і мне часам бывае сумна, бо ў вёсцы няма сяброўак, з якімі можна было б пагуляць ці паразмаўляць у свабодны час.

Сем'і з горада вельмі часта прыязджаюць сюды на адпачынак, бо хаця гэта малая вёска, але скрывае ў сабе многа прыгожых куточкаў. Хаця з моманту ўзнікнення прайшло шмат часу, то ў вёсцы амаль нічога не змянілася. Той сам спакой і тое ж чыстае паветра.

Запісала Уршуля Пташынская, расказвалі Марыя Пташынская і Міхал Рубчэўскі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дэкламатары з Супраслі з матушкай Міраславай Ціханюк

„Роднае слова" ў Беластоку

— Упершыню мы сустракаем дэкламатараў з Супраслі, — адзначыла Валянціна Ласкевіч, вядучая дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова", якое ўжо трыццаць тры гады арганізуе Беларускае грамадска-культурнае таварыства.

Аж 64 удзельнікі, ад прадшколля па гімназію, выступіла з жартоўнымі, патрыятычнымі і рэлігійнымі вершамі.

— Мы лічым, што найважнейшая рэлігія, — кажа матушка Міраслава Ціханюк, апякунка супрасльскай групы, — але і родная мова не менш важная.

З Супраслі прыехалі восем дэкламатараў. Усе яны спяваюць у царкоўным дзіцячым хоры „Загадка". І хоць не вывучаюць у школе беларускай мовы — паказаліся тут надзвычай бліскуча.

Пасля некалькіх гадоў перапынку выступілі таксама дэкламатары з Залук і традыцыйна ўжо з Рыбалаў. Найбольш, бо аж за сорак дэкламатараў, падрыхтавала настаўніца Аліна Ваўранюк з Беластока. Конкурс праходзіў у пасляабедні панядзелак 19 красавіка г.г. Сімпатычным дапаўненнем свята было выступленне маладзёжнага хору „Каласкі" пад кіраўніцтвам Алы Каменскай.

Каміся ў саставе: Тамара Русачык (старшыня), Яніна Плютовіч і Галена Добаш (члены) вызначылі пераможцаў.

Гран-пры павятовага конкурсу ў Беластоку заваявалі: **Юстына Апольская** з Супраслі, **Оля Каліна** з ПШ н-р 4 у Беластоку. Першыя месцы: **Крыся Сакалоўская** і **Паўліна Матэйчук** з Супраслі, **Магдаліна Бабік**, **Лідзія Пякарская**, **Матэвуш Севастыянік**, **Ганна Пякарская**, **Наталля Швед** з Беластока і **Кася Кузьміч** з Гарадка.

Пераможцы паедуць на Цэнтральны дэкламатарскі конкурс у Нараўку, пра які шырэй напішам у наступным нумары.

Зорка

Адмірал і яго каманда

Крапіўнік

Яшчэ паўсюль ляжыць снег, толькі на паўднёвых схілах пагоркаў з'явіліся невялікія праталіны. Ноччу і раніцай не на жартачкі кусаецца мароз — верны служка цётухны-зімы. Затое днём, калі ў бяздонным яркім блакіце залатою кветкаю цвіце сонца, з кожнаю хвілінай усё дружней, шырэй гучыць пераможная музыка вясны. Гэта на зямлі звіняць ручайкі, а ў небе — першыя птушкі, што вяртаюцца з выраю, — жаўрукі, зяблікі, шпакі...

І пад іх натхнёныя галасы на зацішнай сонечнай палянцы ці ў тваім двары, быццам карычневы агеньчык, радасна пырхае-танцуе матылёк-крапіўнік.

Няўжо ён таксама прыляцеў аднекуль з-за мора-акіяна?

Ды не, сябры, крапіўнік зімаваў разам з намі. Доўгія месяцы бесклапотна спаў у якой-небудзь цёплай шчылінцы пад карой дрэва або на гарышчы будынка. Але дыхнула цяпло — і ён тут як тут, першым з матылькоў вітае вяснукрасну. Ну а потым, калі вырасце добра вядомая ўсім жыгучка, крапіўнік адкладзе на яе лісце яйцы. Неўзабаве з іх з'явяцца чорныя з жоўтазялёнымі палоскамі вусені, для якіх крапіўнае лісце — любімы ласунак. Затым вусені ператворацца ў кукалкі, яшчэ праз два тыдні, ужо ў канцы лета, з іх зноўку з'явяцца матылькі. Якраз яны і застануцца на чарговую зімоўку. Вось якое атрымліваецца цікавае жыццёвае кола.

Крапіўнік — даволі распаўсюджаны матылёк, таму на яго амаль ніхто не звяртае ўвагі. Аднак не трэба забывацца: дзівоснае — заўсёды побач з намі.

Уладзімір Ягоўдзік

Тры чарапахі

(рок-карона за найлепшую песню 2000 г.)

Калі раптам адчуеш камунальныя пахі
І жыццё цябе возьме ў пятлю,
Зразумееш тады, што тры чарапахі
Па-ранейшаму цягнуць зямлю.

Калі выйдзеш у горад ці залезеш у горы
І з людзьмі усталюеш кантакт,
Зразумееш тады, што і сёння, і ўчора
Наша месца — на трох кітах.

Прыпеў:
Хэй ла-ла-ла-лай,
Ты не чакай, сюпрызаў не будзе.
Хэй ла-ла-ла-лай,
Ты не чакай, ты не чакай.

Не было Галілея і Боба Марлея,
Не было Сальвадора Далі.
Ні Леніна, ні Ленана, ні Карла Лінэя —
А кіты й чарапахі былі.

Прыпеў...

Каб любіць Беларусь, нашу мілую маму,
Трэба ў розных краях пабываць.
Зразумееш тады — пад тваімі нагамі
Тры сланы нерухома стаяць.

Прыпеў...

Хэй ла-ла-ла-лай,
Ты не чакай, сюпрызаў не будзе.
Хэй ла-ла-ла-лай,
Ніхто не чакае, і ты не чакай.

Польска-беларуская крыжаванка № 18

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 14: Сенакос, вушка, лес, пясняр, хто, рвач, род, ара. Сава, бор, шлях, аркестр, аснова, ар, сустрэча.

Узнагароды — кашулькі „Басовішча 2003" — выйгралі: **Пётр Герасімюк** з Арэшкава і **Міхал Якімюк** з Гайнаўкі. Віншуем! Наш спонсар — **Беларускае аб'яднанне студэнтаў.**

Валачобнікі ў Кнышыне

Сапраўдны фурор выклікаў падгродзенскі, блізка ў сорак асоб, калектыў валачобнікаў „Матуліна песня” на III Міжнародных спатканнях з канапелькай у Кнышыне. Кіраўнік групы, Тэрэза Адамовіч, бывалая на такіх аглядах, сёлета прывезла моладзь і дзяцей — беларусаў.

— На пачатку адзін з маіх калектываў спяваў толькі па-польску для паніча ды паненкі, ну, і, вядома, на хвалу Бога. Цяпер у мяне калектыў беларускамоўны, галоўным чынам дзіцячы. Дзецям хаджэнне з валачобным вельмі падабаецца, а старэйшых яно вельмі ўражвае, бо памятаюць яшчэ жывую на Гродзеншчыне традыцыю, — сказала „Ніве” ў антракце выступленняў спадарыня Адамовіч.

Вядзе яна два калектывы: якраз беларускі народны фальклорны тэатр „Матуліна песня” ў Жытомлі і ансамбль беларускіх палякаў, які называецца „Matczyna Pieśń” у Грыневічах. Абодва ансамблі культывуюць беларускія і польскія традыцыі пагранічча, сярод іх — святочныя. Як тлумачыць вядомы беластоцкі этнограф, працаўнік Ваяводскага асяродка анімацыі культуры Зыгмунт Цясельскі, веснавое калядаванне гэта абрад-абычай выступючы ў палове XX стагоддзя на тэрыторыі паміж Бобрай і Нарвай ды далей на ўсход на Беларусі і Літве, галоўным чынам у памежнай паласе. Адбываўся ён заўсёды ноччу першага дня Вялікадня аж да світання ў святочны панядзелак. Групы хадзілі ад хаты да хаты з г.зв. валачобным, спявалі песні звязаныя з Пасхай. У гэтых песнях сканцэнтраваліся разнародныя моўныя элементы польска-літоўска-беларускага памежжа.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Цяпер у нас калектыў беларускамоўны, галоўным чынам дзіцячы, — кажа Тэрэза Адамовіч

У час афіцыйнага адкрыцця двухдзённага кнышынскага агляду віцэ-консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандр Харытонаў падкрэсліў тое, чаго доказам было выступленне „Матулінай песні”:

— Развой нацыянальных культур — вельмі важны для ўсіх пакаленняў. Культуры памежжа маюць вельмі шмат супольнага.

Віцэ-міністр адукацыі і інфарматызацыі Войцех Шэўка папракнуў ваяводскія адміністрацыйныя і самаўрадавыя ўлады за недахоп зацікаўлення аглядам. Не было на ім ніводнага прадстаўніка ад іх. Патранат над мерапрыемствам трымаў польскі міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, які прыслаў спецыяльны віншавальны ліст.

Цікавінкай агляду было кароткае выступленне (для патрэб Тэлебачання Беласток) „Матулінай песні” ў мясцовым каталіцкім парафіяльным доме. Пробашч разам з маці і гаспадыняй з вялікім зацікаўленнем выслухалі велікодныя песні па-беларуску, якія гучалі, дзякуючы Тэрэзе Адамовіч і яе калектыву, вельмі гучна. Раней на парозе плябаніі ксёндз пасхальным прывітаннем сустрэў валачобнікаў па-беларуску.

Арганізатарам польска-літоўска-беларускага агляду былі Кнышынскі асяродак культуры і ВААК.

Мацей Халадоўскі

Адгалоскі

Алена Анішэўская з Варшавы:

Дарагая Ада, цешымся, што ўдалося нам з Сярожам пазнаць (дзякуючы „Ніве”, нумар 14 ад 4 красавіка 2004 года) твайго мужа праф. Васіля Чачугу. Вітаем яго сардэчна і жадаем далейшых творчых дасягненняў. Вось як склалася — наш сусед Януш Вуйтовіч таксама нарадзіўся ў Плюцічах і даўней ведаў сп. Васіля. Казаў, што ягоны бацька быў там настаўнікам і ў час акупацыі вучыў трох хлопцаў. Адзін з іх гэта быў В. Ч. Бацька нашага суседа даўно памёр, а маці жыве з дачкою ў Бельску-Падляшскім. А ён — архітэктар на пенсіі, ужо 18 гадоў жыве ў нашым доме — у тым самым пад'ездзе.

Вось як плятуцца дарогі жыцця!

Лена, Сярожа

Леначка! Не ўяўляеш сабе, як уцешыўся мой муж, даведаўшыся, што яшчэ нехта, апрача яго, жыве з тае групы дзяцей. А-а-а, дык гэта ж Янушак, сказаў ён і голас яго задрыжаў. Сын нашага настаўніка...

Мой муж да трыццаць дзевятага года закончыў першы клас у польскай школе. Пасля, пры саветах, два гады (1939-41 гг.) вучыўся ў беларускай школе. У сорак першым прыйшлі немцы, і школа ў Плюцічах не працавала. Тут, бадай, памяць крыху падвяла сп. Вуйтовіча, бо яны вучыліся разам не ў перыяд акупацыі, а тады, калі ўжо Беласточчына была вызвалена ад немцаў. Вайна, аднак, яшчэ ішла. Быў год 1944. У плюціцкай школе пачалі вучыцца малалеткі, якім пара было ў школу.

Знайшоўся куток і для тых, што „перараслі”, праседзеўшы тры гады ў хаце.

Сп. Вуйтовіч, пэўна, сябе не лічыў, бо мой муж упіраецца, што было іх не трое, а чацвёра: Васіль Грыгарук (Посэрэднікуў) з Плюціч, Насута з Лысых (мужу здаецца, што клікалі яго Стаськам), Янушак Вуйтовіч, ну, і ён. Сёння ў жывых засталіся толькі яны двое. Магчыма, сп. Вуйтовічу будзе цікава даведацца, што сп. Насута пахаваны на могілках у Райску, а сп. В. Грыгарук гады два таму памёр у Шчэціне, дзе працаваў у Шчэцінскай палітэхніцы. Перад смерцю вельмі прасіў сваякоў, каб паведамілі майго мужа, калі ён памрэ, што яны і зрабілі.

Вяртаючыся да вучобы ў 1944-46 гадах, дык мой муж успамінае, як яны сядзелі ў адным класе з малодшымі вучнямі. Малыя займалі большасць памяшкання, а група старэйшых сядзела ў куточку. Янушак, кажа муж, заўсёды меў зробленыя заданні (пры бацьку-настаўніку яму было лягчэй), дык часта яны спісвалі ад яго. Васіль Посэрэднікуў быў добры ў матэматыцы.

Вядома, у той час, калі асвета толькі арганізоўвалася, настаўнікі не атрымлівалі ніякай зарплаты. Сяляне стараліся плаціць ім нейкімі прадуктамі, харчамі. Муж памятае, як бацька купляў у свайго швагра Сэбэха Артэмюка, які жыў на хутары каля Райска і дзякуючы гэтаму яго дом не быў спалены, пшаніцу для настаўніка.

Наступны этап вучобы майго мужа Васіля Чачугі быў ужо ў Беластоку, куды завёз яго бацька. Там ён памясціў яго на кватэру да былога аднавяскоўца. Было гэта ў верасні 1947 года. Першая школа, у якую хадзіў муж, знаходзілася па вуліцы Варынскага (тады яшчэ Польная), у доме, дзе да нядаўна знаходзілася Генконсульства Рэспублікі Беларусь. Была гэта паўшэхная школа для працуючых.

Вялікае прывітанне ад нас спадару Янушу Вуйтовічу (Янушку).

Ада Чачуга

„Час актывістаў”

Ва ўспамінах N.N. з Чараўкоў, запісаных Аляксандрам Вярбіцкім, чытаем праўдзівыя гісторыі, як пасля вайны савецкія агітатары намаўлялі нашых людзей ехаць у савецкі „рай”. І ў нас гэта было, і многія людзі паверылі гэтым байкам ды на сваё гора туды паехалі. Пацярпеў і мой дзядзька Ванька, які за некалькі шчырых слоў апынуўся ў лагеры ў Сібіры. Толькі дзякуючы таму, што быў вельмі дужы і здаровы, перажыў там чатыры гады. А з тых, што гасцілі агітатараў і іх гарэлкай частавалі, ніхто не паехаў, бо агітатары ім праўду сказалі. Пасля тыя нашы „дзеячы” арганізавалі ў нас калгасы. У Дубічах-Царкоўных таксама заснавалі калгас, забіраючы пад яго найлепшыя землі. У навакольных вёсках не ўдалося прымусіць людзей да калгасаў, ды і ў Дубічах ён развалійся восенню 1956 года. А актывісты пад старасць атрымалі вялікія пенсіі за тое, што калісь мучылі людзей.

Мікалай Панфілюк

Калі непатрэбны аграном

Калісьці ранняй вясной, у сакавіку пачынаўся селяніну гаспадарчы год. На прадвесні часта заглядаў у вясковыя хаты голад і холад і таму сялянскі люд марыў вясной аб багатым ураджаі.

Прырода сама падказвала людзям, калі выходзіць у поле. Звычайна гэта было тады, калі зазелянеў лес, калі прыляталі з выраю птушкі, калі пчолы выляталі з вулляў, а па вечарах з ручаін і балот даносіўся дружны, многагалосы хор вадзяных жаб. Асаблівая ўвага прысвячалася веснавым хрысціянскім святам — Благавешчанню — 7 красавіка, Вялікадню, Юр'ю — 6 мая, Міколу — 22 мая, Ушэсцю, Сёмусе.

Згодна народнаму павер'ю да Благавешчання нельга было трывожыць зямлю: капаць агарод, гарадзіць плот. На Благавешчанне ачышчалі зямлю ад смецця, палілі вогнішчы, спявалі вяснянкі.

Да веснавой сяўбы селянін рыхтаваўся яшчэ ўзімку: адбіраў насенне, ладзіў воз, барану, саху, ці пазней плуг.

Першы выхад у поле быў святочным. Для гэтага гаспадар акрапляў свянцонай вадой рабочых валоў (коней) і пачынаў араць. У гэты дзень араў ён пераважна нядоўга. Зрабіўшы некалькі борозн, вяртаўся задаволены дахаты, дзе сядаў за святочны, падрыхтаваны гаспадыняй, стол.

Колішнія сяляне не мелі магчымасці слухаць гідраметцэнтраў, не маглі карыстацца парадамі аграномаў. Не ўмеючы чытаць і пісаць яны прыдумвалі мудрыя прыказкі, якія былі ім выдатнымі арыенцірамі і якія датрывалі да нашых дзён, напр.: „На Благавешчанне нават птушка гнязда не ўе”, „Зазвінеў жаўрук — не выпускай сахі з рук”, „Красавік з вадою — май з травою”, „Мокры май — будзе жыта як гай”.

Да Міколы (22 мая) у асноўным завяршалася сяўба яравых. У ліку першых высявалі авёс і пшаніцу, з агародных — капусту, затым — ячмень, гарох, проса, каноплі, пазней — лён і грэчку.

Згодна з народнымі прыкметамі рэкамендавалася сеяць авёс, калі з'явяцца камары; пшаніцу — у перыяд цвіцення чаромхі, ячмень — у час росквіту каліны. Найбольш спрыяльнымі для сяўбы лічыліся цёплыя, ціхія і пахмурныя дні.

Існавалі народныя прымаўкі: „Пасля Міколы не сей аўса ніколі” (бо позна), „Прыйшоў Ерамей — больш не сей”, „Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі” (каб не замерзла). Некаторыя людзі звярталі ўвагу і на фазы месяца. Найлепшай лічылася поўня. Гаварылі: „Поўны месяц — поўныя свірны збожжа”. Часамі ўлічвалі дзень тыдня. Перавагу аддавалі аўторку, субоце, крыху меней — серадзе і пятніцы. Не сеялі ў панядзелак. Сяўбу азімых пачыналі пасля Спляння, а завяршалі да Пакровы (14 кастрычніка). Лічылася, што найлепш сеяць жыта пасля Багача (2-я Прачыстая) — 21 верасня. Існавала прымаўка: „Прыйшоў Багач — кідай рагач (саху), бяры сявеньку, сей памаленьку”.

Многа мудрасці і жыццёвай праўды скрываюць народныя прыказкі і прымаўкі. Сучасныя сяляне Нараўчанскай гміны часам гавораць: „Калі ў маі дождж і гром, непатрэбны аграном”.

Мікалай Варанецкі

Сяргей Панізьнік

Unia

Да 435-годдзя Люблінскай уніі

I.

Аглоблі знялюбы

Сарвалі... па конях!

І скачуць на Люблін

Арол і Пагоня.

2.

Там Уніі стома

чакала манарха.

Пайшло ўсё — вядома —

і пухам і прахам.

3.

У Любліне гербам

прыкрыта знямога.

На сёдлы са свербам

лягла перамога.

4.

... Зноў князь да страмёнаў

прынік павадамі.

Дарога праклёнаў

багата сватамі.

5.

Саюзная немач

у лямантах-соплях.

Зноў буду я, невуч,

хадзіць у аглоблях?

Праф. Ежы Нікітаровіч: Не адна экалогія з'яўляецца каштоўнасцю, але і асяроддзе, створанае чалавекам: мова, традыцыі, абрады...

Пушчанская Аркадыя

Калі ні глянуць, людзі марылі пра нейкі рай: ці быў гэта біблейскі Эдэм, ці элінская Аркадыя. І мы будавалі „Другую Польшчу", „Другую Японію". Ды ўсё яшчэ марым каб пагнаць зладзеяў у шкарпэтках або хаця самога Бальцаровіча...

15 красавіка ў Нараўцы прайшла канферэнцыя пад лозунгам „Краіна шчаслівасці. Рэгіён Белавежскай пушчы — перспектывы развіцця ў Еўрасаюзе"; канферэнцыю ладзіў фонд Цэнтр нацыянальнай творчасці з удзелам Нараўчанскай гміны. Чаму Нараўчанская, менавіта, гміна? Бо, як мне здалося, яна ўжо адной нагой і крочыць у тую краіну шчаслівасці.

Паўтара дзесяцігоддзя таму наша тутэйшая прырода бадай кацілася ўжо ў экалагічную бездань. Наступала дэградацыя паверхневых вод у Беластоцкім ваяводстве: воды Нарвы страцілі прыгоднасць для арашэння, воды Бобры на 75% яе працягласці не адпавядалі ніякаму класу чысціні, таксічныя сцёкі з Гайнаўкі дэградавалі каля 200 гектараў пушчы.

Славамір Галёнка, зачыншчык Краіны шчаслівасці і арганізатар канферэнцыі, ва ўступным слове да яе напісаў: „Белавежская пушча, гэта не толькі выдатныя прыродныя каштоўнасці, але — галоўным чынам — месца, дзе пранізваюцца розныя культуры, мовы, веравызнанні, традыцыі, абрады. Гэтае агромнае багацце ад шэрагу дзесяцігоддзяў галее і сёння пад вялікай пагрозай.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Праф. Ян Чыквін

Некаторыя мовы, традыцыі, абрады гінуць, астаецца пасля іх пустата".

Прафесар Ежы Нікітаровіч з Беластоцкага універсітэта заўважыў, што не адна экалогія з'яўляецца каштоўнасцю, але і асяроддзе, створанае чалавекам: мова, традыцыі, абрады. Настаўнікі не прыстасаваны да працы ў шматкультурным асяроддзі, а здараліся і такія выпадкі, калі дырэктар школы, актывіст БГКТ, забараняў сваім вучням карыстацца ў школе роднай мовай. Вялікі патэнцыял маем у пенсіянерах, якімі адукацыя не карыстаецца; дзеці, шляхам кантакту са стваральнікамі і носьбітамі традыцыі, бераж-лівей да яе адносяцца. І нельга адварочвацца плячыма да суседзяў.

Апошняя справа ў нашай краіне выглядае, далікатна кажучы, мінорна. Прафесар Ян Чыквін, старшыня Літаб'яднання „Белавежа", звярнуў увагу на вялікую асіметрыю ў польска-беларускіх літаратурных дачыненнях, дзе пераклады беларускай літаратуры на польскую мову складаюць каля аднаго праміля перакладаў польскай літаратуры на беларускую мову.

Трывогай было напоўнена і выступленне Анны Радзюкевіч са штомесячніка „Przegląd Prawosławny". Мова акрэслівае спадчыннасць, а невядома, ці беларуская мова будзе наяўнай, ці будзе прыхоўвацца, паказвацца толькі на фэстах. Ці ў свеце масавай культуры, які губляе маральныя арыенціры і заворвае мяжу між дабром і злом, магчымая рэфлексія пра сэнс жыцця?..

Захаванне культурнай спадчыны мае не толькі духоўную мэту, але і чыста меркантыльную. Бо культурная адметнасць, побач экалагічных і гігіенічных фактараў, мае прыцягваць грошы ў ваколпушчанскую інфраструктуру. Сёння не ідэалогіі, але грошы вызначаюць вектары грамадскай актыўнасці і мо яны, парадаксальна, задзейнічаюць у зусім іншым напрамку, чым дагэтуль. У Краіне шчаслівасці „кожны будзе згодна са сваёй воляй развівацца, даглядаць традыцыі сваіх продкаў і жыць дастойна", — мяркуе Славамір Галёнка.

(ав)

Праваслаўныя грамадзяне Рэчы Паспалітай, роспачна абараняючы свае старыя правы „рэлігіі грэцкай", выказваліся за культурнай і цывілізацыйнай прыналежнасцю да супольнасці, з якой вырасталі...

Праваслаўе і беларускасць

У кніжцы „Вера і гісторыя" яе аўтар Аляксандр Наумаў у першым раздзеле прысвечаным праваслаўнай культуры на польска-літоўскіх землях на першы план высунуў два важныя элементы, якія назваў „самасвядомасцю праваслаўя". Першы з іх гэта кірыла-мяфодзіеўская традыцыя, другі — традыцыя старарускай. Мае рацыю аўтар, калі робіць агаворку, што гістарычная памяць абымае межы рэлігійнай і культурнай супольнасці і неабавязкова яны мусяць супадаць з колішнімі і цяперашнімі межамі дзяржаў.

Каб прасачыць самыя важныя, паводле мяне, элементы беларускай нацыянальнай свядомасці і ролю праваслаўя, гэтаму пытанню трэба было б прысвяціць не адну кніжку, а не толькі кароткі тэкст. Таму варта засяродзіць увагу на вельмі важным для гісторыі Русі і Усходняй царквы канцы XVI і XVII стагоддзі. Тады менавіта мелі месца два здарэнні, якіх паслядоўнасці адчуваюцца па сённяшні дзень. Гэта, па-першае: Брэсцкая унія, а па-другое: падпарадкаванне Кіева і Правабярэжнай Украіны Маскве карэнным чынам паўплывалі на пазіцыю Праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Тады таксама праваслаўныя грамадзяне Рэчы Паспалітай, роспачна абараняючы свае старыя правы „рэлігіі грэцкай", выказваліся за культурнай і цывілізацыйнай прыналежнасцю да супольнасці, з якой вырасталі і якая дапамагала ім захаваць сваю адметнасць. Калі ў абароне свайго веравызнання тыя ж аргументы прымянялі святары, царкоўныя дзеячы, шляхта ці мяшчане, гэта сведчыла толькі аб адным — аб свядомасці супольнай прыналежнасці да тых самых каранёў.

Праваслаўная шляхта хадайнічала аб „задавальненні рэлігіі грэцкай", спасылаючыся на pacta conventa элекцыйных каралёў, інкарпарацыйны акт усходніх ваяводстваў у склад Кароны, прынцыпы рэлігійнай свабоды, якая абавязвала ў Рэчы Паспалітай, на гарантаванае праваслаўным грамадзянам права „ўжывання вольнага набажэнства Русі ў Русі", дадзенае польскімі каралямі Казімірам Вялікім, Уладзіславам Ягайлам, Уладзіславам Варненскім, Аляксандрам.

Заступнікамі за „рускую справу" былі вельмі актыўныя ў Рэчы Паспалітай XVI-XVII стст. царкоўныя брацтвы, якія ў абароне праваслаўя і „правоў рускіх" заключылі саюз з казацтвам. Найбольш красамоўным прыкладам гэтага саюза, апрача супрацоўніцтва з Пятром Канашэвічам-Сагайдачным, была казацкая падтрымка мітрапаліту Пятру Магілу пры заснаванні Акадэміі, якая з часам прыняла яго імя.

У рэлігійных палеміках XVII стагоддзя іх аўтары спасылаліся на „мілую" кожнаму сэрцу Русь. Можна меркаваць, што на гэтыя захады грамадства не заставалася абыякавым. Палемісты намагаліся дайсці да прыхільнікаў, для якіх ужываныя імі сімвалы былі яснымі. Апрача таго ў рэлігійных спрэчках удзельнічалі ў прынцыпе амаль усе грамадскія саслоўі. З праграмай „задавальнення рэлігіі грэцкай" выступала шляхта, да таго не толькі праваслаўная і не толькі руская. У абароне рэлігійнага міру выказваліся грамадзяне Рэчы Паспалітай, каб прытармазіць хвалю грамадскага неспакою, каб шанаваліся шляхецкія правы і рэлігійныя свабоды. У 1623 г. у „Суплікацыі", адрасаванай сенату, якой аўтарам праўдападобна быў валынскі шляхціц Лаўрэнцій Дрэвінскі, пісалася, што нельга даводзіць да стану, „каб Русі не было ў Русі". Аўтар „Суплікацыі" лічыў, што знішчэнне ўсходняй веры абазначае знішчэнне ўсяго рускага народа. Знак роўнасці паміж рэлігіяй, веравызнаннем і нацыянальнай тоеснасцю тут вельмі відавочны.

Пэўным сумным парадоксам было тое, што расчляненне праваслаўнай грамадскасці ў Рэчы Паспалітай пасля ўвядзення Брэсцкай уніі — на прыхільнікаў і праціўнікаў уніі — паўплывала на развіццё нацыянальнай самасвядомасці. Менавіта тады ставіліся пытанні: Хто з'яўляецца сапраўдным русінам? Хто нясе адказнасць за нацыянальную нязгоду?

„Падбухторваеце рускі народ супраць польскаму, — піша адзін з самых цікавых палемістаў гэтага часу Мялецій Сматрыцкі, звяртаючыся да уніятаў, — калі нас у мінулым пункце нашымі паложанымі спосабамі ў ляцкую веру (як у Русі звычайна гаворым) заганяеце".

Мялецій Сматрыцкі, сын Герасіма Сматрыцкага — першага рэктара Астрожскай школы, выдатны прадстаўнік тадышняй інтэлектуальнай эліты Усходняй царквы, у вядомым творы „Трэнас, альбо Плач святой Усходняй царквы" пералічыў амаль пяцьдзесят рускіх родаў, якія пакінулі веру сваіх продкаў. Не ўсе роды апынуліся на гэтам спіску абгрунтавана, частка не пакінула праваслаўя, аднак паэтычная форма і экспрэсія ўздзеяння моцна ўражвала слухачоў і чытачоў. З такой самай эмацыянальнасцю і талентам бараніў ён унію пасля сваёй канверсіі ў 1626 годзе.

(заканчэнне будзе)

Пятро Хомік

У беларускім сеціве няшмат экалагічных сайтаў...

bp21.iatp.by

Праблема экалогіі час ад часу набывае вострае гучанне. Асабліва гэта адбываецца тады, калі здараецца нейкая значная падзея з негатыўным адлюстраваннем. Менавіта такой стала амаль два дзесяткі гадоў таму Чарнобыльская катастрофа. Але экалагічныя пытанні паўстаюць не толькі з-за рознага кшталту катастроф і аварый, а часцяком з-за бяздумных адносін чалавека да навакольнага асяроддзя. Разам з тым, знаходзяцца людзі, якія неабыякавыя да прыроды і стараюцца прыцягнуць увагу грамадскасці да той ці іншай экалагічнай праблемы. Адным з такіх высілкаў можна назваць сайт аб Белавежскай пушчы.

Калі карыстальнік выйдзе на http://bp21.iatp.by, перад ім адкрыецца зялёна-жоўтае выяўлунне з загалоўкам „Белавежская Пушча — XXI ст.” Пад ім на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай на жоўтым фоне распавядаецца пра асноўную мэту сайта. З гэтых расповедаў, націснуўшы на „Далей”, можна перайсці на галоўную старонку. Калі гэта зрабіць з беларускай версіяй, то на галоўнай старонцы адразу высвятляецца рамка, у якой з прыкрасцю гаворыцца: „Даруйце, усе абнаўленьні беларускай вэрсіі сайту шчэ не гатовыя. Сьвежыя навіны і артыкулы можна чытаць у расейскай вэрсіі”. І сапраўды, паглядзеўшы на кароткі анонс навінаў, што месціцца з правага боку, можна ўбачыць, што апошняе абнаўленне там было ўжо амаль год таму. Разам з тым гэта не перашкаджае азнаёміцца са зместам галоўнай старонкі пабеларуску. А там, між іншым, распавядаецца, што будучыня Белавежскай пушчы знаходзіцца пад пагрозай, бо разгорнута там інтэнсіўная гаспадарчая дзейнасць. Хачу зазначыць, што тычыцца гэта той часткі Белавежжа, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Бо, як вядома, польская частка старажытнага лесу, па меншай меры цяпер, такіх клопатаў не мае.

Калі ж далей вандраваць па „Белавежскай Пушчы — XXI ст.”, то варта націснуць на адзін з падзагалоўкаў, што размешчаныя пад назвай сайта. У рубрыцы „Ідэя” распрацоўшчыкі старонкі распавядаюць аб тым, што іх падштурхнула да яе стварэння. І сярод асноўных прычын называецца малалікасць Інтэрнэт-рэсурсаў, прысвечаных белавежскай праблематыцы. Трэба адзначыць, што гэта не дзіўна. У беларускім сеціве добра калі ўвогуле знойдзецца каля паўтара дзесятка экалагічных сайтаў, большай часткай даўно не працуючых, ці без абнаўленняў цягам некалькіх месяцаў. Можа падацца, што стан навакольнага асяроддзя хвалюе ў Беларусі жменьку энтузіястаў.

У рубрыцы „Пра Пушчу” распавядаецца пра тое, як рэліктавы лес стаў запаведнікам, пра флору і фауну Белавежжа ды гістарычныя падзеі, якія мелі месца на яе тэрыторыі. Сярод іх, зразумела, сусветна вядомыя Віскулёўскія пагадненні, у якіх была канстатаваная смерць СССР.

Даволі цікавыя дакументальныя матэрыялы змешчаныя ў „Фотафакце”, дзе па словах стваральнікаў сайта, карыстальнік можа пазнаёміцца з сучаснай гісторыяй вынішчэння белавежскага лесу. Сапраўды, здымкі высечкі жывых векавечных дубоў і хвояў уражваюць, штурхаюць, па меншай меры, да спачування. Ды і ўвогуле само знаходжанне на старонках сайта выклікае жаданне дапамагчы пушчы.

„Форум” дазваляе пакінуць у так званай гасцявой кнізе свае ўражанні ад сайта. А вось рубрыка „Спасылкі” з'яўлецца свайго роду выйсцем да іншых Інтэрнэт-парталаў па белавежскай і агульнаэкалагічнай тэматыцы. Сярод іх, між іншым, і польскія сайты, а таксама міжнародныя экалагічныя арганізацыі і рухі.

(ул)

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...

Фехтавальшчыкі на першай Алімпіядзе ў Афінах, 1896 г.

Відавочна, што летам у сталіцы старажытнай Элады беларусы маюць вялікія шанцы заваяваць юбілейны 200-ы медаль. Адзначым, што пазіцыі нашых суайчыннікаў у сама „нацыянальных” відах — спартовай гімнастыцы і фехтаванні заслаблі настолькі, што чакаць прызавых поспехаў у гэтых дысцыплінах не даводзіцца. Так мужчыны-гімнасты не прайшлі нават адборавае ліцэнзаванне. Асноўныя надзеі ўскладаюцца на лёгкаатлетаў, весляроў, барцоў, гімнастак-„мастачак”, цяжкаатлетаў, стралкоў і адзінкавых рэпрэзентантаў — зорак у асобных відах спорту (такіх як Наталля Цылінская ў веласпорце, Уладзімір Самсонаў у настольным тэнісе, Алена Попчанка ў плаванні). Больш дэталёвы аналіз патэнцыялу беларусаў у Грэцыі напярэдадні. Пакуль жа адзначым, што прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандрам Лукашэнкам (які па сумяшчальніцтве выконвае абавязкі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) пастаўлена канкрэтнае заданне — заваяваць 25 медалёў. „Бітва за ўраджай” абвешчаная сур'ёзная, і калі задача не будзе выканана, чыноўніцкіх крэслаў пазбавяцца многія спартовыя функцыянеры. Між тым, лічба 25 падаецца цяжкадасягальнай, больш рэальная колькасць медалёў — 14-17. Само вызначэнне задання выглядае абсурдным. Пакуль кваліфікацыйныя нарматывы, якія даюць права на паездку ў Афіны, выканалі 116 беларускіх атлетаў, якія прадстаўляюць 19 відаў спорту. У многіх дысцыплінах адбор яшчэ доўжыцца. Прагназуецца, што алімпійскія ліцэнзіі атрымаюць каля 160 беларускіх спартоўцаў. Гэтая колькасць можа і павялічыцца, калі нашы футбалісты на моладзевым чэмпіянаце свету, які пройдзе ў канцы мая — першай палове чэрвеня ў Нямеччыне, здолеюць трапіць у тройку мацнейшых.

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Чарнобыль стаміў Беларусь

18 гадоў мінула з той пары, калі ва ўкраінскім Чарнобылі прагрымеў ядзерны выбух. „Мірны атам” у імгненне вока прынёс такія беды і гора дзесяткам тысяч беларускіх, украінскіх і расійскіх сем'яў, што можна лёгка параўнаць з невялікай лакальнай вайной, з адным толькі адрозненнем — перамагчы навалу здолее хіба толькі час.

Найбольш пацярпела ад Чарнобыльскай катастрофы менавіта тэрыторыя Беларусі, пятую частку якой пакрыў радыяцыйны попел. 70% усіх выкідаў са зруйнаванага блока атамнай электрастанцыі апусцілася на беларускія гарады, вёскі, лясы, рэкі і палеткі. Але асноўная шкода была нанесена здароўю людзей і нанесена яна не толькі самой радыяцыяй, а часцяком хаваннем праўды ад насельніцтва пра небяспеку.

Успамінаючы той красавіцкі дзень 1986 года, калі я быў яшчэ падлеткам, прыгадваю незразумелыя для мяне размовы ў сям'і, што нешта дзесьці адбылося. Мой дзед, які амаль штодня слухаў „Голас Амерыкі”, казаў, што амерыканцы распавядалі аб выбуху на атамнай электрастанцыі недзе на Украіне. Нашы радыё і тэлебачанне аб нечым такім як заўсёды маўчалі. Толькі праз некалькі дзён было афіцыйна паведамлена аб тэхналагічнай аварыі на Чарнобыльскай АЭС. А да той пары ў паветры, вадзе і на зямлі „сеяў” нябачную вокам атруту радыеактыўны ёд. Пра яго нават словам ніхто не згадваў. Узгадалі пасля, за восем дзён, калі ён напаўраспаўся і небяспека, такім чынам, нібыта мінула і ўсё стала добра. Прымаць нейкія меры супрацьдзеяння гэтаму першапачатковаму апраменьванню ніхто не думаў.

Людзей з трыццацікіламетровага абшару ад станцыі вывезлі практычна адразу. Забруджаную радыяцыяй тэрыторыю, а гэта ў большай ступені радыеактыўны цэзій і стронцый, падзялілі на некалькі зон, з рознай чарговасцю адсялення насельніцтва адтуль. Але выконвалася ўсё гэтае адсяленне, як кажуць, як мокрае гарыць. Не кажучы ўжо пра тое, што на той тэрыторыі засяваўся, вырошчваўся і збіраўся, добра набраўшы радыяцыю ўраджай 1986 года. Не адной тысячы маладых беларусаў давялося падыхаць атрутным пылам на тых бульбяных палях падчас восеньскай паездкі ў калгас, дапамагаючы нашаму нямогламу калгаснасаўгаснаму ладу „карміць” народ. Як сёння помню верасень 1986 года, калі мяне разам з іншымі навучэнцамі аднаго з магілёўскіх тэхнікумаў прывезлі у слаўгарадскую вёску Гайшын, дзе ўжо будаваліся дамы для чарнобыльскіх перасяленцаў, а праз месяц-другі цэлую гэтую вёску пачалі высяляць з-за вялікай радыяцыі. Тое ж самае адбылося і з вёскай Бяззуевічы, на мяжы з Гомельскай вобласцю, дзе мы цягам месяца кватаравалі.

— Прыязджалі тут нейкія начальнікі, казалі каб не пілі сваё малако, бо там „рацыя”, а толькі кефір, — распавядала нам бабуля-гаспадыня. — Мы можа тыдзень не папілі, а потым паспрабавалі, дык ніякай „рацыі” не знайшлі і цяпер п'ем.

Не знаходзілі „рацыі”, як аказалася, не толькі вясковыя бабулі. Магілёўскія вышэйшыя чыноўнікі былі падобныя на іх. Менавіта таму выводзілі яны па ўсёй вобласці на першамайскія дэманстрацыі людзей, якія разам са сваімі дзецьмі ў поўныя грудзі ўдыхалі радыяцыю, хварэючы потым на лейкемію і рак шчытападобнай залозы. Увосень наступнага года студэнты і навучэнцы зноў паехалі „на бульбу” ў зону з радыеактыўным забруджаннем.

Пачатак 1990-х стаў нейкім абуджэннем ад напляваццельскага на сябе сну. Да вырашэння чарнобыльскай праблемы актыўна далучылася грамадства. Зразумела, далёка не кожны рупіўся за здароўе суайчыннікаў. Былі і такія, што добра „нагрэліся” на замежных грошах і матэрыяльных дапамогах. Але чарнобыльская катастрофа стала называцца тым, чым была павінна называцца — сапраўднай народнай бядой.

Сёння гэта ўжо не бяда. Многія вёскі, згодна меркаванню кіруючай улады, зноў лічацца прыгоднымі для жыцця. Ім папросту трэба крыху больш дапамагаць, толькі на практыцы грошай на гэтую дапамогу звычайна не хапае. Не хапае грошай і на ільготы тым, хто страціў сваё здароўе з-за выбуху на ЧАЭС.

Зразумела, нешта дагэтуль робіцца дзеля ліквідацыі наступстваў найвялікшай у свеце тэхнагеннай катастрофы не толькі праз дзяржаўныя органы, але і праз малалікія ўжо грамадскія арганізацыі. Але чарнобыльскае пытанне зноў усё менш цікавіць беларускую ўладу і беларускае насельніцтва. Пацвярджэннем гэтаму сталі апошнія парламенцкія слуханні ў Нацыянальным сходзе, дзе казалася аб „стомленасці Чарнобылем”. А вынікам такой стомленасці стала тое, што ў параўнанні з менш пацярпелымі ад катастрофы Расіяй і Украінай, найбольш пацярпелая Беларусь аказвае сваім „чарнобыльцам” найменшыя ільготы і сацыяльную абароненасць.

Уладзімір Лапцэвіч

ДАПАМАГАЦЬ У БЯДЗЕ

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Сацыяльная дапамога з'яўляецца інструментам сацыяльнай палітыкі дзяржавы для пераадольвання жыццёвых цяжкасцей сем'ямі, якія не могуць адолець гэтай праблемы карыстаючыся ўласнымі сродкамі і магчымасцямі.

Гарадскі асяродак сацыяльнай дапамогі ў Бельску-Падляшскім абсягам сваёй дзейнасці ахоплівае гарадскую гміну, якая на канец мінулага года налічвала 28 236 жыхароў. Найбольш складанай праблемай у Бельску з'яўляецца 9-працэнтнае беспрацоўе. У канцы мінулага года ў Павятовай управе працы ў Бельску было зарэгістравана 1 772 беспрацоўных жыхароў горада (з гэтага ліку 910 жанчын); права на засілак мела адно 229 асоб. Беспрацоўе з'яўляецца галоўнай прычынай аказвання сацыяльнай дапамогі, з-за якой у мінулым годзе засілкі атрымала 759 сямей, а гэта абазначае, што амаль палова асоб, зарэгістраваных ва ўправе працы, ахоплена сацыяльнай дапамогай. Такая сітуацыя характэрная, галоўным чынам, працягла беспрацоўным, часта з прафесійнай адукацыяй, звышсаракагадовым, якім бесперспектыўна перакваліфікоўвацца.

З ліку бельскіх беспрацоўных 122 маюць вышэйшую адукацыю, 542 — звышліцэйскую і сярэднюю прафесіянальную, 171 — сярэднюю агульную, 492 — асноўную прафесіянальную ды 445 — гімназічную і ніжэйшую.

У Гарадскім асяродку сацыяльнай дапамогі працуе 34 асобы, а яго дзейнасцю кіруе Зіновія Таранта.

— Дзейнасць нашага асяродка, — кажа яна — кіруецца ў прынцыпе на асобы і сем'і. Нашай задачай з'яўляецца фінансавая, матэрыяльная, юрыдычная і псіхалагічная падтрымка; нам трэба быць там, дзе бяда, бо сапраўдная бяда „не крычыць".

У 2003 годзе сацыяльную дапамогу атрымала 2 288 асоб з 1 394 сям'і. З плана расходаў велічынёю 2 458 876 злотаў на ўласныя задачы расходавана 620 тысяч злотаў і на даручаныя: 1 650 188 на засілкі і дапамогу натурай, 94 399 — складчыны на сацыяльнае страхаванне, 57 300 — складчыны на лячэбнае страхаванне, 73 918 — сямейныя і дагляданьныя засілкі, 50 тысяч — датацыя на падкормліванне вучняў, 7 470 — датацыя на дзіцячыя прыданыя (школьныя выпраўкі). Задачы, даручаныя гмінам, склалі 74,78% агульнага плана, рэшта — гэта ўласныя задачы гміны, якімі ў мінулым годзе было ахоплена 1 853 асобы з 1 170 сем'яў. Абавязковыя задачы былі рэалізаваны шляхам дагляданьня, паховін (тры — за 3 184 зл.), лёсавых засілкаў, абедаў для дарослых і дзяцей. Гміна мае законны абавязак забяспечыць адной гарачай стравай у суткі асобу, якая не ў змозе зрабіць гэта самастойна; гэтым пакарысталіся 86 асоб з 82 сем'яў у 13 396 пастаўках вартасцю 50 786 злотаў. Да гэтай катэгорыі з 1996 года залічваюцца таксама школьнікі і моладзь, якім аказваецца дапамогу шляхам аплаты абедаў у школьных сталовых або ў іншых харчавальнях; такую дапамогу, вартасцю ў 230 333 злотаў, атрымала 887 дзяцей.

— Вельмі важнай дзялянкай нашай працы, — кажа Зіновія Таранта, — з'яўляецца дагляданьне. Бяльшчане старэюць ды штораз часцей хварэюць. Сем'і — з-за нізкай адплатнасці за такія паслугі (за гадзіну 11,96 зл. без скідкі) — аддаюць сваіх блізкіх пад дагляд тады, калі самі не могуць справіцца са старымі, знясіленымі або хворымі ды не хочуць пакідаць працу. У мінулым годзе дзевяць апякунак даглядала за 46 асобамі. Такія паслугі выконваюцца пяць разоў у тыдзень і ахопліваюць заспакаенне штодзённых жыццёвых патрэб, гігіенічную апеку ды прапісаны лекарам лячэбны дагляд і, па меры магчымасцей, заспакаенне сувязі з вонкавым светам.

Асяродак ладзіць супрацоўніцтва са шматлікімі ўстановамі і арганізацыямі, фондамі і таварыствамі, Касцёлам і Царквой, штогадова арганізуе экуменічную вігілію для прыблізна васьмідзесяці чалавек. Асяродак збірае ўжываныя адзежу і прыборы. Для прыкладу, у мінулым годзе бельская фірма „Konstdrew" перадала абутак вартасцю ў амаль трыццаць тысяч злотаў. За ўласныя сродкі асяродак купляе камплекты пасцелі, пледы, падушкі, коўдры. Летась Агенцтва сельскагаспадарчага рынку перадало са сваіх запасаў 5 400 кансерваў вагай у 2 388,5 кілаграма, якімі да канца студзеня абдорана 740 сямей.

Міхал Мінцэвіч

У Беластоцкім лялечным тэатры

Рэпертуар для дзяцей

„Пінокіо". Сцэнарый — Юзаф Кроофта, пераклад — Галіна Сікорава, рэжысура — Веслаў Чалпінскі, музыка — Пятро Назарук. 1, 2, 3 мая — 11^{00}, 6 мая — 9^{00} і 11^{00}, 7 мая — 9^{00}, 8 мая — 11^{00}, 9 мая — 11^{00}.

„Джэльсаміна ў краіне манюк". Пераклад і апрацоўка — Ганна Ажагоўская, адаптацыя, дыялогі і сцэны — Вальдэмар Сьмігасевіч, рэжысура — Вальдэмар Сьмігасевіч, сцэнічнае афармленне — Мацей Прэер, музыка — Кшыштаф Дзерма. 22 мая, 17^{00} — ПРЭМ'ЕРА, 23 мая — 11^{00}, 25, 26, 27, 28 мая — 9^{00} і 11^{00}, 29 і 30 мая — 11^{00}.

Рэпертуар для дарослых

„Organillo". Аўтар — Стэфэн Мотрам, музыка — Себастыян Кастанья. 5 мая — 19^{00}.

„Хай жыве Панч!". Сцэнарый — Владзімеж Фэлэнчак, рэжысура — В. Фэленчак і Войцех Шэляхоўскі, сцэнічнае афармленне — Веслаў Юркоўскі, музыка — Ежы Дэрфэль. аранжыроўка — Марэк Кулікоўскі. 8, 9, 29 і 30 мая — 19^{00}.

„Плашч". Паводле Мікалая Гогаля. Аўтар — Юльян Тувім, рэжысура — Пётр Дамброўскі, сцэнічнае афармленне — Марэк Мікульскі, музыка — Ежы Хрусьцінскі. 11, 12, 13 і 14 мая — 9^{00}; 15 і 16 мая — 18^{00}. **(лук)**

У Міхалоўскай гміне

Улады Міхалоўскай гміны ў мінулым годзе здалі ў карыстанне водаправод у Ялоўцы. Сёлета ваду з крана атрымаюць Кабылянка, Таніца, Юшкаў Груд, Патока, Гозна і Сушча.

У 2003 годзе адрамантавалі дарогу ў вёску Лявонавічы (сяло распаложана каля Шымкаў), а ў гэтым годзе адрамантуюць дарогу з Навасадаў у Залешаны. Сёлета пакладуць асфальт на адрэзку дарогі з Шымкаў у Цісоўку. У Шымках пракладуць тратуары.

Праз год-два ў Ялоўцы будзе прыемна ездзіць па асфальтавай вуліцы Дворнай (у 2005 годзе), а таксама па Ліпавай ды па вулічцы каля царквы (у 2006 годзе).

Велікоднае яйка

Гмінны цэнтр культуры, спорту і адпачынку ў Міхалове (Беластоцкі павет) арганізаваў конкурс на найцікавей размаляванае велікоднае яйка.

Пераможцам стаў Матэвуш Точка. Другое і трэцяе месца занялі Малгажата Міруць і Данута Язгарская.

За найпрыгажэйшыя святочныя адкрыткі ўзнагароды атрымалі Анжэліка Малашэўская, Мар'ян Вішнеўскі і Паўліна Міруць, а за пальмы — Анна Бура, Агата Казбярук і Юстына Саўка.

(яц)

Спартыўны пікнік у Гайнаўцы

1 мая г.г. у 10 гадзін на стадыёне Асяродка спорту і адпачынку (АСіА) у Гайнаўцы распачнецца Павятовая спартакіяда прадпрыемстваў. Арганізуюць яе Павятовае аб'яднанне ЛЗС, АСіА і Гайнаўскі дом культуры.

Адбудуцца футбольныя і валейбольныя розыгрышы ды зямнога тэніса, а таксама спаборніцтвы ў іншых дысцыплінах, у тым ліку трохбор'е для бурмістраў, рэктараў, старшынь і кіраўнікоў.

Для пераможцаў прадбачаны медалі, кубкі, статуі.

Пасля заканчэння спаборніцтваў на пляцоўцы каля Гайнаўскага дома культуры (па вуліцы Беластоцкай, 2) выступяць музычныя калектывы, можна будзе таксама падсілкавацца кілбаскамі падагрэтымі на вогнішчы. **(яц)**

Абвесткі

Экалогія на Гайнаўшчыне

На працягу 12 гадоў у ваяводстве пабудавалі 70 ачышчальняў. Цяпер у Гайнаўскім павеце працуе 10 іх, з гэтага ліку тры ў Нараўчанскай гміне. У гміне ўжо 99% хат падключылі да водаправоднай сеткі, а да каналізацыйнай 42% сёння; з канцом года гэты лік перасягне палову. Кацельні працуюць на экалагічным паліве, звалка адкідаў — перспектыўная. Клопаты: дрэнны насціл на добрых дарогах, недастатковая турыстычная база, невялікая даступнасць да Інтэрнэту. ***(ав)***

Выставы ў Белавежы

Белавежскі асяродак культуры *запрашае глядзець выставу „Белавежа на старых фотаздымках" у мясцовым кінатэатры „Зубр", ад панядзелка да пятніцы, ад 9 да 16 гадзіны.*

* * *

Дырэкцыя Белавежскага нацыянальнага парку *запрашае наведаць цікавую выставу пад загалоўкам „Байкал — святое мора". Адкрылі яе ў Прыродазнаўча-лясным музеі БНП у Белавежы (у Палацавым парку), які працуе ад 9 да 16 гадзіны.* ***(яц)***

* * *

Прадам ужываныя ксераксы, Беласток, тэл. (+48) 888 198 934.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Вер — не вер...

Шаноўны Астроне! Прысніліся мне два сны: адзін, як мне здаецца, кепскі, а другі — добры. Можа ты мне ўдакладніш, што яны могуць абазначаць. Для мяне гэта вельмі важна, бо сямейная сітуацыя ў нас вельмі нацягнутая. Баюся, што ўсё вось-вось лопне. Муж шмат п'е, а ў апошні час у яго завялася каханка, якая намаўляе яго на развод. Мне пра ўсё гэта данеслі, але я раблю выгляд, што нічога не ведаю.

Дык вось, у першым сне мне прыснілася, што ў мяне з рота пасыпаліся ўсе зубы. Я іх збіраю па падлозе, упіхаю назад у дзясны, прыціскаю, падтрымліваю, а яны не трымаюцца. Я думаю, што гэта сон, які прадвяшчае няшчасце.

Затое другі сон быў цудоўны. Быццам я знаходжуся ў нейкім памяшканні цудоўнай прыгажосці. Усюды стаіць прыгожая старая мэбля — цёмнага колеру, уся рэзбленая. Усюды (не толькі мэбля) стаяць „антыкі" — старыя вазы, розныя гістарычныя памяткі, багаты посуд. Я хаджу па пакоях, аглядаю ўсё гэта і захапляюся. Думаю, што гэты сон дасць мне надзею на добры зыход справы.

Падкажы, дарагі Астроне! Ужо не маю сіл думаць пра маю будучыню.

Ірка

Ірка! А вось жа ты і не ўгадала. Калі першы сон ты расшыфравала даволі трапна, дык памыляешся ў інтэрпрэтацыі другога сну.

Першы сон прадвяшчае страту нейкага блізкага табе чалавека, але якроўнага. Магчыма муж сапраўды кіне цябе. Ты будзеш старацца неяк усё наладзіць, пазбіраць, але табе гэта не ўдасца, так як не ўдалося паўпіхаць тыя выпаўшыя зубы ў дзясны.

Твой другі сон толькі на выгляд добры. У сапраўднасці ён вельмі сугучны з першым. Тая прыгажосць у сне — здрадлівая, бо не прадвяшчае яна табе ніякай асалоды, хаця ў сне ты глядзела на ўсё гэта з вялікім задавальненнем. Наадварот, сцвярджае гэты сон той факт, што сапраўды твой муж табе здрадзіў. Такім чынам, я не бачу ніякай надзеі на паляпшэнне тваёй сямейнай сітуацыі. Мусіш быць падрыхтаваная да ўсяго.

Астрон

Музычныя навіны

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

Слава Корань (здымак) **— лідэр легендарнае каманды „Уліс" шукае новых музыкантаў.** Зараз ва „Улісе" застаўся толькі Слава ды басіст Сяргей Храмцоў. Бубнач Аляксандр „Ганс" Быкаў сышоў, бо хоча засяродзіцца на іншым музычным праекце — „Крамбамбуля". Акрамя таго, Слава Корань вырашыў пашырыць канцэртны склад „Уліса" да чатырох чалавек, каб стварыць належны эфект ды наблізіць канцэртны гук да альбомнага. З гэтай нагоды лідэр „Уліса" хацеў бы пабачыць у шэрагах групы клавішніка ці ды-джэя, які б добра ведаў сваю справу. Абноўлены „Уліс" будзе рыхтавацца да „Басовішча-2004", а далей да вялікага сольнага канцэрта, які Слава Корань спадзяецца зладзіць бліжэй да кастрычніка. Асноўнае патрабаванне да новых музыкаў — жаданне граць. Ну, і натуральна, уменне. **Тыя музыканты, хто хоча звязаць свой лёс з легендаю айчыннага рока — звяртайцеся да Славы Кораня на тэл. 288-14-95.**

У траўні лідэр групы „Юр'я" Юры Выдронак збірае лепшыя айчынныя фольк-гурты разам на фэсце „Таўкачыкі". Фэст праводзіцца ўжо другі раз, сёлета ўпершыню ён пройдзе не толькі ў Мінску. „Таўкачыкі" пройдуць у тры этапы. **4 траўня** выступяць фальклорныя калектывы „Госьціца", „Ліцьвіны", „Guda", „Кудзмень". **5 траўня** плануецца вялікі канцэрт у кінаазале „Мінск", дзе сыграюць гурты фолькрокавай скіраванасці: „Ur'ia", „Kriwi", „Стары Ольса", „Палац", „Znich", „Postscriptum", „Бан Жвірба". **6 траўня** ў заключны дзень фэсту „Ur'ia", „Палац", „Яр" ды іншыя сыграюць у Любані (150 км ад Мінска).

25 красавіка ў мінскім Лядовым палацы адбыўся самы буйны беларускі рок-фэст апошніх гадоў „Генералы айчыннага року". 4 гадзіны жывога гуку агульнай магутнасцю 30 кілават. Першая частка фэсту — конкурс маладых гуртоў. На сайце „Тузін гітоў" і ў „Музычнай газеце" вызначыліся сем фаварытаў — „B. N." (Бяроза), „Haradzkija" (Мінск), „Partyzone" (Мінск), „Znich" (Мінск), „Куклы" (Мінск), „Сцяна" (Брэст), „Тэзаўрус" (Мінск). Пераможцы атрымаюць прызы ад фундатараў канцэрта: 1-е месца — магчымасць запісаць альбом; 2-е — зняць кліп; 3-е — прафесійны мікрафон ад. Пасля заканчэння конкурсу маладых выканаўцаў на сцэну выйдуць госці фэсту, прадстаўнікі розных плыняў сучаснай беларускай музыкі — гурты „P.L.A.N.", „Zet", „Żygimont Vaza", „Стары Ольса". Потым выступяць самыя вядомыя выканаўцы айчыннага рока — „Kriwi", „N.R.M.", „Крама", Кася Камоцкая, „Нейра Дзюбель", „Уліс".

Татка Стэп

2.05 – 8.05

Баран (21.03. — 19.04.) 4.05. у час зацьмення Месяца твае фінансавыя справы могуць згарэць. Не ўлазь у пазыкі і іншыя забавязанні. 7 мая канфлікты ў сям'і, шмат нерваў, можаш нарабіць сабе ворагаў.

Бык (20.04. — 20.05.) 3.05 будзеш падатлівы на ўплывы кепскіх асоб. Жарсная сувязь. Цешся жыццём, не сумуй на запас. Еш бульбу, караняплоды, пі шмат вады.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Пераможаш усе перашкоды 2 — 5.05. Рамантычныя сустрэчы і гарачыя флірты. У час цалкавітага зацьмення Месяца (5 — 6.05.) — непрыемнасці. Абгаворацъ цябе няшчырыя сябры.

Рак (22.06. — 22.07.) 7.05. будзеш змагацца; гарантаваная перамога ў прафесійных справах. Зацьменне Месяца будзе мець кепскі ўплыў на твае пачуцці. Будзеш мець невычэрпную энергію, будзеш вельмі актыўны, але патрэбны табе спакой і адпачынак. Увесь месяц не еш салодкага.

Леў (23.07. — 22.08.) 3 — 5.05. не плануй сур'ёзных прафесійных і службовых мерапрыемстваў. Будзь асцярожны аж па паловы мая. Магчымыя канфлікты. Не падпісвай важных дакументаў.

Дзева (23.08. — 22.09.) Паспяхова пераканаеш іншых да сваіх ідэй, ажыццявіш твае планы. У любові дбай таксама аб сяброўства. Добры настрой і аптымізм, але і выдатны апетыт; што цікавае — не патаўсцееш!

Шалі (23.09. — 23.10.) Ахвота маніпулявання іншымі. Калі ўчыніш хібны крок, сустрэнешся з рашучым супрацівам атачэння і давядзеш да вострых канфліктаў. Жарснае каханне. Увесь месяц маеш шанц выйграць немалую суму!

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Знакаміты час вучыцца — галава ўбірае веды як губка ваду! Глядзі, каб не ўпусціць з вока таго, хто табе наканаваны лёсам! Эмацыйнае замяшанне. Слухай голасу развагі. 3 — 5.05. — моцная матывіроўка і прабойная сіла на працы. Слухай свой арганізм: сэрцу неабходны кісларод.

Стралец (22.11. — 21.12.) Чакаюць цябе новыя захапленні і вяртанне да старога кахання. 4.05. — меланхалічны настрой. Дома не ўпірайся пры сваіх рацыях. Хай поспех на працы не пераверне табе ў галаве!

Казярог (22.12. — 20.01.) Адчуеш сябе чалавекам поспеху. 4.05. — ненайлепшыя кантакты з сябрамі. Пазбягай няшчырых людзей. Будуць зайзросціць табе поспеху. Працавіты тыдзень. Ашчаджай на канікулы. Лепш высыпайся.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Аграмадны падарунак жыццёвай энергіі ад зорак. Лішкі энергіі спальвай на працы. Прыцягваць цябе будуць эксцэнтрычныя і вельмі арыгінальныя асобы. Але асцярожна са „скокам убок"! Дома будзеш мець падтрымку ў сваякоў. Займіся сваёй кар'ерай.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Ад 3 да 7.05. не дамаўляйся на ніякія важныя сустрэчы, не праводзь асноўных размоў. Пазбягай алкаголю. Не выбірайся за мяжу. Калі ты самотная Рыба, 7.05. руш наперад, твая ініцыятыва давядзе да поспеху. Рамонт у гэты тыдзень выкліча нервовую атмасферу. У дыету ўвядзі больш каш.

Агата Арлянская

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41	42	43	44	45	46	47	48	49	50
51	52	53	54	55	56	57	58	59	

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Марлены Дзітрых.

1. канец малітвы = 46 _ 41 _ 42 _ 43 _;
2. супрацьлегласць катода = 39 _ 38 _ 48 _ 49 _;
3. перапончатакрылае насякомае з джалам = 23 _ 24 _ 37 _;
4. паселішча на Каўказе або ў Сярэдняй Азіі = 26 _ 29 _ 45 _;
5. від азартнай карцёжнай гульні = 13 _ 12 _ 58 _ 11 _;
6. шалаш, будан = 19 _ 59 _ 17 _ 18 _;
7. адзінка спадчыннага матэрыялу, якая вызначае фарміраванне элементарнай структуры жывога арганізма = 47 _ 56 _ 57 _;
8. насякомае з жорсткім надкрыллем, напр. каларадскі ... = 32 _ 33 _ 55 _;
9. калектыў людзей, якія аб'ядналіся для супольнага жыцця на пачатках абагуленай маёмасці і працы = 1 _ 2 _ 30 _ 31 _ 50 _ 20 _;
10. між красавіком і чэрвенем = 28 _ 34 _ 27 _;
11. мяккія і тонкія валаскі пад пер'ем птушак = 35 _ 54 _ 10 _;
12. гомельская рака = 53 _ 6 _ 5 _;
13. вадкая страва для першага блюда = 14 _ 44 _ 15 _;
14. грашовае выражэнне вартасці тавару, напр. для „Нівы" — 2 злоты = 22 _ 16 _ 7 _ 9 _;
15. вялікая звязка, напр. саломы = 21 _ 52 _ 8 _;
16. майстар, які вырабляе ўпрыгожанні з каштоўных металаў з каштоўнымі камянямі = 51 _ 25 _ 40 _ 3 _ 4 _ 36 _;

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 12 нумара

Віно, вол, дым, каваль, католік, куцця, Нараўка, печ, пешка, рака, сноп, Сталін, стан, янкі, Ярыла.

Рашэнне: **Чалавек як скрыпка — калі лопне апошняя струна становіцца кавалкам драўніны.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960